(47) 1392

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

КАТЭДРА МАРКСЫЗМУ-ЛЕНІНІЗМУ — ВЫПУСК ПЕРШЫ

С. Я. ВОЛЬФСОН

# СУЧАСНАЯ РЭЛІГІЙНАСЬЦЬ

## (ПАВОДЛЕ МАТАР'ЯЛАЎ ДАСЬЛЕДВАНЬНЯ У БССР)

ВЫДАНЬНЕ БЕЛАРУСКАЕ АКАДЭМІІ НАВУК

МЕНСК — 1930

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК
КАТЭДРА МАРКСЫЗМУ-ЛЕНІНІЗМУ

ПРАЦЫ. ВЫП. I

С. Я. ВОЛЬФСОН

# СУЧАСНАЯ РЭЛІГІЙНАСЬЦЬ

(ПАВОДЛЕ МАТАР'ЯЛАЎ ДАСЬЛЕДВАНЬНЯ Ў БССР)

ВЫДАНЬНЕ БАН
МЕНСК — 1930

BIBLIOTEKA NARODOWA
I. 497. 545
Biblioteka Narodowa
Warszawa
30001010737796

# ПРАДМОВА.

Гэта праца зьяўляецца вынікам дасьледваньня рэлігійных настрояў у БССР, якое вяла Катэдра Марксызму-Ленінізму Беларускай Акадэміі Навук на працягу 1929/30 ак. году.

У гэтым дасьледваньні катэдры значна дапамаглі мясцовыя краязнаўчыя організацыі, якія з вялікай ахвотай распаўсюджвалі і дасылалі нам анкетны матар'ял. Статыстычная распрацоўка ўсяго сабранага матар'ялу зроблена С. Н. Слупскім, ім складзены і даданыя табліцы. За актыўнае і дзейнае супрацоўніцтва на працягу ўсяе работы прыношу т. Слупскаму ўдзячнасьць.

*С. Вольфсон.*

Менск.
Верасень 1930 г.

## I.

# АБ ШЛЯХОХ ВЫВУЧЭНЬНЯ РЭЛІГІЙНАСЬЦІ Ў СССР.

Пэрыод социялістычнай рэконструкцыі савецкай дзяржавы выклікаў значнае ажыўленьне на фронце антырэлігійнай барацьбы.

Узмоцнены социялістычны наступ на капіталістычныя элемэнты краіны, з аднаго боку, актывізаваў рэлігійны рух, які падтрымліваюць гэтыя элемэнты.

Зруйнаваныя рэволюцыяй пасьледкі эксплёататарскіх кляс і паразытычных груп насельніцтва з асаблівым імпэтам цягнуцца да рэлігіі, як адзінай легальнай магчымасьці ў СССР організоўваць варожыя социялізму элемэнты. Рэлігія робіцца прытулкам для ўсіх выкінутых рэволюцыяй за борт, для ўсіх „униженных и оскорбленных“ перамогшым пролетарыятам, для былых людзей усіх рангаў і масьці. Яна робіцца вагаром супраціўленьня социялістычнаму наступу з боку прышчэмленых социялізмам кулацкіх і нэпманскіх паскробкаў капіталізму. Аб гэтым сьведчаць шматлічныя судовыя процэсы розных рэлігійных контр-рэволюцыянэраў тыпу хвёдараўцаў, украінскіх аўтакефалістых, фанатычнай групы Шульца і іншыя процэсы, быўшыя на працягу апошніх двух гадоў. Сусьветная рэакцыя абвяшчае валёзунгі новай інтэрвэнцыі ў Савецкі Саюз пад сьцягам ваяўнічага клерыкалізму. Такім ёсьць ажыўленьне, якое пануе на адным баку барыкад рэлігійнага фронту.

На другім баку гэтых барыкад мы бачым, як культурная рэволюцыя актывізуе сьвядомасьць шырокіх мас і накіроўвае іх ад рэлігійна-містычных мараў да навукова-матар'ялістычнага сьветапогляду. Бурліва разгорнутае социялістыч-

нае будаўніцтва, якое захапіла сваім працоўным энтузыязмам мільённыя масы, гіганцкія тэмпы індустрыялізацыі і электрыфікацыі краіны зьяўляюцца найвялікшымі фактарамі росту атэізму. Гістарычная замена большай паловы прымітыўных дробных індывідуальных адзінак сельскай гаспадаркі тэхнічна высокай, буйнай колектыўнай гаспадаркай нанесла руйнуючы ўдар рэлігіі, выцясьняючы яе з апошніх прытулкаў. Пераход на неперарыўны вытворчы год, пяцідзёнка, самавыкрываньне контр-рэволюцыйнай сутнасьці рэлігіі—усё гэта ўзмацняе процэс распаду і развалу рэлігіі, прысьпешаны, апрача гэтага, прыметным ростам арганізацыі ваяўнічых бязбожнікаў, якая пяць год назад ледзь налічала ў сваіх радох 70000 членаў, а цяпер мае больш $3^1/_2$ мільёнаў чалавек.

Усё гэта, аднак, ні на хвіліну не дазваляе лічыць рэлігію ў СССР пераможаным ужо ворагам. Нельга забывацца на лічбу ў 1000000 рэлігійных актывістых у Савецкім Саюзе, з іх да 250000 профэсіяналаў рэлігіі. Нельга забывацца і на той мільён, які, паводле некаторых даных вызначае лік сэктантаў у савецкай дзяржаве. Успомнім яшчэ пра сотні тысяч „хрыстамольцаў“, „бапсамольцаў“, пра 50000 рэлігійных аб‘яднаньняў, пра існаваньне шматлічных багаслоўскіх акадэмій, „пастырскіх“ курсаў, царкоўных школ, сынагогальных школ і г. д. [1]).

[1]) Вось цікавыя даныя аб выпуску рэлігійных кадраў у СССР. Маскоўская багаслоўская акадэмія штогод выпускае 15—20 высококваліфікаваных „пастыраў“. Выкладаюць у акадэміі старыя профэсары духоўных акадэмій, але програма выкладаньня зусім абноўлена: тут выкладаюць ня толькі гісторыю хрысьцянскай моралі і сэктазнаўства, студэнты там знаёмяцца і з сучаснымі плынямі ў галіне грамадазнаўства. Большасьць слухачоў — моладзь узростам 20—25 г., ёсьць былыя настаўнікі, ёсьць нават члены профсаюзаў. Пасьля сканчэньня курсаў слухачы выяжджаюць на месцы. Некаторыя абсталёўваюцца ў савецкіх установах і часам ціпіком, з сапраўднымі пінкэртонаўскімі пераапрананьнямі, выступаюць у цэрквах ужо ў якасьці важных царкоўных чыноў. Так, напр., у адным з Маскоўскіх трэстаў служыў нядаўна скромны бугальтар, які ў нядзельныя дні рабіўся біскупам і вёў набажэнства ў царкве на Ільлінцы. Аналёгічны выпадак быў у аднэй з рэдакцый кіеўскіх газэт, дзе рэпортэр газэты сумяшчаў сваю газэтную працу

Гэта досыць пераканаўча сьведчыць аб тым, што рэлігію яшчэ ніякім чынам нельга лічыць пераможаным ворагам. Гэта яшчэ—вораг жывы і вораг сур'ёзны. Такім ён будзе да таго часу, покуль соцыялізм канчаткова пераможа. „Толькі соцыялізм, толькі поўнае зьнішчэньне кляс вядзе да поўнага адміраньня рэлігіі“ [2]). Да таго часу, пакуль мы яшчэ змагаемся за соцыялізм, покуль разгортваецца бязьлітасная клясавая барацьба, нам прыходзіцца весьці змаганьне і з рэлігіяй.

З гэтае прычыны недапушчальнымі зьяўляюцца ўпадніцка-ліквідацыйныя настроі адносна рэлігіі, фаталістычна-мяккадушнае назіраньне таго, як будзе праходзіць „натуральны“, „няўнікнёны“ процэс яе аджываньня, опортуністычна-бязьдзейнае назіраньне таго, як „самацёкам“ будзе пашырацца ў нас атэізм. За атэізм трэба змагацца, трэба ваяваць, за яго трэба біцца ўсімі тымі сродкамі, якія мы маем і якія могуць быць мэтазгоднымі ва ўмовах нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Аднак, барацьба з рэлігіяй ня можа быць праведзена шляхам голага адміністраваньня. Тыя „ура-атэістыя“, як абазваў іх т. Яраслаўскі, што хочуць замяніць упартую, настойлівую барацьбу з рэлігійнымі перажыткамі

---

на працягу шасьці дзён бальшавіцкага друку са службай біскупа па нядзелях у кіеўскіх цэрквах.

У Кіеве трэці год існуе багаслоўская школа. У школе і кулацкія дзеці, і былы партыец-чыгуначнік, і харкаўскі рабфакавец, і прыехаўшыя з провінцыі для перакваліфікацыі старыя папы. Рэктар школы — магістар і профэсар багаслоўя—чалавек з вышэйшай адукацыяй. Апрача звычайных багаслоўскіх навук, на сталох у студэнтаў знойдзеце працы Дэборына, Бэльшэ. Тут ідзе старанная падрыхтоўка да будучых дыскусій з супраціўнікамі. У студэнтаў — „грамадзкая нагрузка“. Яны ў індывідуальным парадку праводзяць рэлігійную работу ў масах. (Против религии. Библиотека агитатора. АППО ЦК ВКП(б). 1929. стр. 18-19). Як далёка ідзе „прыстасаваньне“ рэлігійнікаў да сучаснасьці паказвае вядомая пастанова Эпархіяльнага зьезду Тульскай губэрні, які абавязаў духоўніцтва вывучаць... „Капітал“ К. Маркса.

[2]) Постановления Второго Всесоюзного С'езда Союза воинствующих безбожников СССР.

спосабамі адміністрацыйнага выкарчаваньня рэлігіі, прыносяць нашаму антырэлігійнаму руху найвялікшую шкоду.

Барацьба з рэлігіяй патрабуе вывучэньня рэлігіі. Каб перамагчы ворага, трэба ведаць яго. Тав. Лукачэўскі на першай Усесаюзнай Конфэнцыі гісторыкаў-марксыстых правільна зазначыў, што мы вельмі многа опэруем у сваіх развражаньнях аб рэлігіі ў СССР агульнымі і прынцыповымі разважаньнямі і вельмі мала займаемся вывучэньнем конкрэтнага стану рэчаў: „Нам цяпер патрэбны не абстрактныя схэмы, а фактычны, конкрэтны матар'ял і вывады на падставе гэтага матар'ялу... Канечна трэба перш сабраць фактычны матар'ял і на грунце гэтага фактычнага матар'ялу зрабіць марксыцкі клясавы аналіз". Вось катэгорычнае патрабаваньне, што выстаўляецца цяпер, як адна з умоў пасьпяховай і карыснай барацьбы з рэлігіяй. Недарма Другі Ўсесаюзны Зьезд Саюзу ваяўнічых бязбожнікаў падкрэсьліў, што адным з асноўных недахватаў нашай антырэлігійнай работы ёсьць „адсутнасьць сыстэматычна наладжанага вывучэньня рэлігійнага фронту".

Трэба прызнацца, што да гэтага часу якімі-небудзь значнымі посьпехамі ў перамозе гэтых абставін мы пахваліцца ня можам. Тым часам, усё больш патрэбным робіцца зьвязаць нашыя агульныя марксыцкія ўстаноўкі адносна рэлігіі з конкрэтным фактычным узятым з нашай савецкай рачаіснасьці, матар'ялам, які адлюстроўвае датычныя рэлігіі процэсы, маючыя месца ў Савецкім Саюзе.

Нам раней за ўсё трэба вывучыць соцыяльна-клясавае аблічча веручай арміі, вызначыць, якія клясавыя групы зьяўляюцца ў нас носьбітамі і консэрватарамі рэлігіі, у якіх соцыяльных пластох рэлігія знаходзіць сабе ў савецкіх умовах падтрыманьне. Нам канечна трэба прамацаць і соцыяльныя карэньні рэлігіі ў СССР, г. зн. выявіць, якія соцыяльныя фактары дапамагаюць пашырэньню сярод мас рэлігійнай інфэкцыі і якія, наадварот, гэту інфэкцыю зьнішчаюць. Нам важна дазнаць, як дзеюць на прыхільнасьць да рэлігіі

такія фактары, як культурны ровень, узрост, род, нацыянальнасьць. Канечна патрэбна дасканалае і ўсебаковае вывучэньне дынамікі рэлігійнасьці ў пасьлякастрычнікавы пэрыод,—мы павінны вывучыць крывую рэлігійнасьці на працягу рэволюцыі і ўмець увязаць гэту крывую з тымі соцыяльна-клясавымі процэсамі, якія адбываліся ў Савецкім Саюзе. Мы зацікаўлены ў тым, каб вызнаць, якія перагрупоўкі і пад якім уплывам адбываліся і адбываюцца ў тэолёгічным стане. Нам трэба дазнацца, у якія формы выліваецца ў Савецкім Саюзе ў розных клясавых групах прыхільнасьць да рэлігіі, чаму і якім чынам адбываецца выцясьненьне адных форм рэлігійнасьці другімі. Мы павінны вывучыць структуру рэлігійнай організацыі СССР у яе ўсялякіх разгалінаваньнях, яе іерархічныя прынцыпы, яе сыстэму кіраўніцтва, яе мэтоды работы, яе агітацыйна-пропагандыцкія спосабы, хітрыкі, ўжываныя для „уловления душ". Нам трэба заняцца дасканалым аналізам асабістага складу рэлігійнага актыву і г. д., і г. д. Мы далёка не пералічылі тых конкрэтных задач, якія стаяць перад намі ў справе фактычнага вывучэньня рэлігійнасьці ў СССР.

Але і сказанага досыць, каб зразумець, якія важныя і адказныя гэтыя задачы. І як раз з гэтае прычыны нельга абыйсьці іх. Вырашэньне іх патрабуе дапасаваньня шмат якіх мэтодычных спосабаў: экспэдыцыйных досьледаў, бытавых нагляданьняў, скарыстаньня даных актаў грамадзянскага стану і параўнаньня іх з данымі аб выкананых абрадах, утылізацыі статыстычных вестак, якія даюцца пры рэгістрацыі рэлігійных аб'яднаньняў і г. д. Сярод гэтых мэтодычных спосабаў адным з найбольш мэтазгодных, на нашу думку, гэта спосаб, пакладзены ў аснову данай працы, г. зн. мэтод анкеты.

Мы, бязумоўна, улічаем усе недахваты, з якімі зьвязана кожнае анкетнае дасьледваньне (суб'ектывізм у адказах, няправільныя адказы, ухіленьні ад адказаў, выпадковасьць адбору дасьледваных і г. д.). Але ня будзе памылкай сьцьвяр-

джаць, што, ня гледзячы на ўсе гэтыя няўхільныя недахваты, наша анкета дае значны матар'ял.

Нам здаецца, што сабраны анкетным шляхам і падаены ніжэй матар'ял будзе карысным пры вырашэньні коратка паказаных вышэй задач па вывучэньні рэлігійнасьц Гэты матар'ял павінен дапамагчы нам зрабіць досыць абгрунтаваныя вывады аб становішчы ў пераходны пэрыод рэлігіі — гэтай самай рэакцыйнай ідэолёгіі, якая асуджана на пагібель няўхільнай канчатковай перамогай соцыялізму, але якая да часу можа яшчэ адыгрываць ролю пэўнай перашкоды на шляху пераможнага руху да соцыялізму.

## МЭТОДЫКА РАБОТЫ.

Рознастайнасьць спосабаў і сыстэмы вывучэньня рэлігійных настрояў можна прывесьці да адзінага мэтоду масавага дасьледваньня, разьлічанага на вялікую колькасьць об'ектаў і абгрунтаванага радам жыцьцёвых характарыстык. Зрабіць такое вывучэньне магчыма шляхам улічваньня рэлігійных організацый, дамоў малітвы, процанту і складу наведваньня апошніх; можна таксама з гэтай мэтай правесьці вывучэньне рэлігійнай абрадовасьці; не малое значэньне ў галіне вывучэньня рэлігіі можа мець і этнографічнае апісаньне розных сьвят з вызначэньнем іх соцыяльна-клясавай дэтэрмінаванасьці.

Новым трэба лічыць спосаб анкетнага дасьледваньня рэлігійных настрояў. Як невялікая спроба ў гэтым кірунку такое дасьледваньне было праведзена намі ў 1929 г.[1]).

Вынікі дасьледваньня, даўшага багаты матар'ял у гэтай галіне, узьнялі пытаньне аб яго паўтарэньні ў пашыраным маштабе.

[1]) Гл. Полымя. № 10. С. Вольфсон. Сучасныя рэлігійныя настроі на Беларусі.

На працягу 1930 г. на нарадах Катэдры Марксызму-Ленінізму Беларускай Акадэміі Навук было абмеркавана пытаньне аб правядзеньні анкетнага дасьледваньня сучасных рэлігійных настрояў у Савецкай Беларусі. Вынікі зробленага дасьледваньня і зьмяшчаюцца ў гэтай працы.

Перад анкетай намі пастаўлены былі наступныя асноўныя заданьні: высьвятленьне дынамічнасьці рэлігійных настрояў паводле ўзросных пэрыядаў, уплыў сямейнага асяродзьдзя, школы, літаратуры, вайны, рэволюцыі і іншых фактараў соцыяльна-політычнага характару. Адпаведна з гэтым была пабудавана анкета, якая складалася з 20 пунктаў і конкрэтызавала прынцыповыя ўстаноўкі вывучэньня рэлігійных настрояў. У анкеце прадугледжаны пытаньні бытавога соцыяльна-політычнага зьместу, якія павінны былі выкрыць з магчымай паўнатой як гнёзды рэлігійнасьці, так і фактары атэістычных настрояў, паказаць разам з гэтым і выплываючыя з гэтых даных мерапрыемствы для барацьбы з рэлігійнымі забабонамі. Анкета, праведзеная ва ўмовах строгай анонімнасьці, такім чынам мела такую форму:

АНКЕТА.

1. Мясцовасьць: а) дзе нарадзіўся (горад, акруга, раён) ..........

..........

б) дзе цяпер жыве ..........

2. Узрост .......... 3. Род .......... 4. Нацыянальнасьць

5. Чым займаецца ..........

6. З якой сям'і паходзіць (заняткі бацькоў, дзе гадаваўся да 8 год) ..........

..........

..........

7. Якую адукацыю атрымаў ..........

8. Як адносіліся ў вашыя дзіцячыя гады да рэлігіі ў вашай сям'і (бацькі, браты, сёстры і г. д.) ..........

..........

..........

9. Ці мелі вы веру ў бога ў гэтым узросьце і ў якім выглядзе яго ўяўлялі

..........

10. Хто галоўным чынам накіроўваў вашы думкі ў бок рэлігійнасьці (бацькі, бабка, дзед, мамка, таварышы) і ў якую форму гэта вылівалася (байкі, жыцьцё сьвятых і г. д.) ..................

11. Якія рэлігійныя абрады вы выконвалі ў гэтым узросьце ..................

12. Як выконвалі вы гэтыя абрады: добраахвотна ці пад прымусам ..................

13. Вашы адносіны да рэлігіі ва ўзросьце ад 8—18 гадоў ..................

14. Які ўхіл на складаньне вашых рэлігійных поглядаў мела школа, вытворчасьць ці іншае месца; якія работы (сялянства, батрацтва, а таксама і чытаньне кніг) ..................

15. Вашы адносіны да рэлігіі ў сучасны момант: а) ці верыце ў бога і як сабе яго ўяўляеце, б) ці зьяўляецеся прыхільнікамі якой-небудзь з існуючых рэлігій (праваслаўная, каталіцкая, юдзейская, протэстанцкая), ці выконваеце рэлігійныя абрады ..................

16. Ці належыце да якой-небудзь з існуючых рэлігійных сэкт, з якога часу і пад уплывам чаго ўвайшлі ў склад гэтае сэкты ..................

17. Калі вы не належыце ні да якой з афіцыяльных рэлігійных сэкт, але ўсе-ткі лічыце сябе за веручага чалавека, дык у якую форму вылііваюцца вашыя рэлігійныя настрoі ..................

18. Ці быў у вашым жыцьці пералом ад веры ў бога да бязбожжа і наадварот — ад бязбожжа да веры ў бога і ў якім узросьце

19. Чым быў выкліканы гэты пералом

20. Што маеце дадаць

Анкета праводзілася шляхам мэханічнага распаўсюджваньня (самацёкам) сярод вялікай колькасьці розных груп гарадзкога і вясковага насельніцтва, без папярэдняга ўліку патрэбных об'ектаў дасьледваньня. Студэнты, настаўнікі служачыя рабочыя, курсанты былі нашымі супрацоўнікамі ў распаўсюджваньні анкет па вёсках, на фабрыках, заводах, колгасах і г. д.

Адсутнасьць адпаведнай тыполёгічнасьці ў распаўсюджваньні анкет можна лічыць і дадатным і адмоўным бокам дасьледваньня, але ў далейшым была зроблена значная папраўка.

Усяго было распаўсюджана 11000 анкет, з якіх вернута 3629. Трэба адзначыць, што пэўная частка запоўніўшых анкеты, зрабіла гэта чыста формальна, часта абмежаваўшыся нічога ня вартымі, кароткімі і бяз зьместу трафарэтнымі адказамі: „рэлігія—дурман“ і г. д. Здараліся выпадкі і хуліганскіх выбрыкаў і відочна няпраўдзівых адказаў, але пераважная большасьць даслаўшых анкеты аднеслася да іх запаўненьня з поўнай сур'ёзнасьцю і вялікай зацікаўленасьцю. Шмат хто прыпісваў да анкеты просьбу хутчэй распрацаваць яе.

Пры распаўсюджваньні анкет сярод асноўных мас насельніцтва трэба было захаваць роўнамернасьць адносна

BIBLIOTEKA NARODOWA

розных груп і ў той-жа час мець гарантыю об'ектыўнасьці дасьледваньня і выплываючай законамернасьці.

Дасьледваньнем ахоплена вялікая тэрыторыя БССР, пачынаючы з поўначы і канчаючы паўднёвай часткай Палесься. Раскіданасьць тэрыторыі дасьледваньня такая вялікая, што для картаграфічнага фіксаваньня яе трэба ўсю карту БССР укрыць сеткай пунктаў, з якіх атрыманы анкеты.

У выніку падліку месц і паселішч, якія далі нам анкеты, выходзіць, што ахоплена насельніцтва 20 гарадоў і 225 вёсак. Мы маем матар'ялы амаль з кожнага раёну БССР, прадстаўлены таксама ўсе гарады. Твар рэлігійных настрояў, такім чынам, адлюстраваны ў шмат мясцох БССР.

Адным з важных момантаў зьяўляецца высьвятленьне закранутага намі пытаньня аб об'ектыўнасьці дасьледваньня і пабудове на грунце гэтага законамерных залежнасьцяй. Праверкай ступені роўнамернасьці, а таксама захаваньня меры ліку, як канечна патрэбных умоў для атрыманьня законамернасьцяй маючай быць вывучанай зьявы, могуць быць паказальнікі двох сумежных гадоў у іх схэматычнай характарыстыцы—з аднаго боку; вывады ўсяе далейшае работы—з другога.

У форме схэмы мы падамо ўзросныя даныя аб процанце веручых і няверучых 1929 і 1930 г.

| Узрост | Веручых | | Няверучых | |
|---|---|---|---|---|
| | 1929 | 1930 | 1929 | 1930 |
| 17—19 | 10,9 | 6,9 | 89,1 | 93,1 |
| 20—24 | 14,4 | 10,7 | 85,6 | 89,3 |
| 25—29 | 23,6 | 19,0 | 76,4 | 81,0 |
| 30—39 | 29,0 | 26,5 | 81,0 | 73,5 |
| 40—49 | 50,0 | 40,0 | 50,0 | 60,0 |
| 50 і вышэй | 73,0 | 65,7 | 27,0 | 34,3 |
| Усяго . . | 30,0 | 26,7 | 70,0 | 73,5 |
| % росту . . | 100 | 88 (—12) | 100 | 110 (+10) |

Нават пры павярхоўным праглядзе гэтай схэматычнай табліцы заўважаецца паступовасьць павялічэньня рэлігійных і зьніжэньня атэістычных настрояў паводле ўзросту. З аднаго боку—рэзкае зьніжэньне рэлігійных і адпаведнае павышэньне атэістычных настрояў у маладым веку, а з другога—паступовы рух гэтых настрояў у больш старым веку. Калі агульны паказальнік павышэньня атэістычных настрояў параўнаць з рухам школ першага концэнтру, як першых натхняльнікаў масавых бязбожных настрояў, дык абодвы гэтыя паказальнікі будуць аднолькавымі: рост іх 10%.

У дадатак да матар'ялаў па „самацёку" было праведзена спэцыяльнае дасьледваньне груп насельніцтва,—спэцыфічных характарам заняткаў, абставінамі жыцьця і другімі момантамі. Сюды ўвайшлі групы рабочых паперні ў Добрушы і панчошнай фабрыкі ў Віцебску, якія ў агульным складзе даюць групу ў 250 чал., становячы ў масе дасьледваных 6,8%; гэта група, можна сказаць, авангардная па ваяўнічым бязбожжы. Потым дасьледвана група колгасьнікаў у ліку 146 асоб; як асобная група ахоплена 65 чалавек навуковых працаўнікоў Горацкай С.-Гаспадарчай Акадэміі, Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту і Віцебскага Вэтэрынарнага Інстытуту. Як асобная група былі дасьледваны зьняволеныя Менскага Папраўчага Дому, даўшыя 655 адказаў (18,3%), падрабязна выказаўшыя свае рэлігійныя пераконаньні, а таксама, з прычыны асаблівага значэньня сэктанцкіх організацый, была дасьледвана евангэлічная ў сваёй большасьці в. Балочыцы, адкуль атрымана 252 анкеты ці 6,9% агульнае колькасьці. Мы ўлічалі пры гэтым тую акалічнасьць, што самацёк анкетнага дасьледваньня дае матар'ял, сабраны паводле асаблівага мэтоду і характэрны для больш шырокай масы насельніцтва. Што да вылучаных груп, дык ня гледзячы на мэханічны мэтод распаўсюджваньня анкет сярод іх усё-ж яны даюць тыповы матар'ял, а дзеля таго было-б вялікай мэтодолёгічнай памылкай прыводзіць усё дасьледваньне да адзіных паказальнікаў. Далейшае выкладаньне

так і пабудавана, што кожная група зьяўляецца асобнай адзінкай. І вос, раўнуючы канчатковыя вынікі атэістычных настрояў усіх дасьледваных груп, будзем мець наступны законамерны парадак, які сьцьвярджае правільнасьць выказаных намі вышэй думак:

| | Няверучых | Індэкс | Веручых |
|---|---|---|---|
| Рабочыя . . . . . | 98,5 | 100 | 1,5 |
| Навуковыя працаўнікі . . | 98,4 | 99 | 1,6 |
| Колгасьнікі . . . . | 82,2 | 84 | 17,8 |
| Самацёк 1930 г. . . . | 74,0 | 76 | 26,0 |
| „ 1929 г. . . . | 70,0 | 71 | 30,0 |
| Зьняволеныя . . . . | 48,6 | 49 | 51,4 |
| В. Балочыцы . . . . | 28,5 | 30 | 71,5 |

Паказваючы гэта ў індэксах, прыраўнаваных да групы рабочых, мы будзем мець вельмі выразную крывую зьніжэньня бязбожжа і адпаведнага росту веры.

Суадносіны розных паказальнікаў рэлігійных настрояў зусім адпавядаюць характару параўнавальных груп—з аднаго боку, соцыяльна шкодны элемэнт і сэктанты-фанатыкі з глухой вёскі, з другога—пролетары і масы працоўнага насельніцтва. Лічбы добра адлюстроўваюць усё гэта ў далейшых разьдзелах, якія раскладаюць матар'ял па сыстэме соцыяльных груп і па фактарыяльных адзнаках.

Увесь атрыманы анкетны матар'ял распрацаваны ў 11 табліцах—максымальна і ў 4—як мінімум. Пры распрацоўцы кіраваліся характарам матар'ялу і магчымасьцю вывесьці тыя ці іншыя законамернасьці. Пералічэньне табліц у дадатку паказвае, што найбольш поўна прадстаўлены групы „самацёку", распрацаваныя 1) па роду, пісьменнасьці і мясцовасьці; 2) па веку; 3) па веку ў сувязі з характарам рэлігійных настрояў; 4) па нацыянальнасьці; 5) па адукацыі; 6) паводле соцыяльнага стану і 7) паводле соцыяльнага паходжэньня; 8) паводле ўплыву на рэлігійныя настроі розных

фактараў; 9) па прычынах пераломy ад веры да атэізму; 10) па ўяленьнях веручымі бога і 11) па выкананьні абрадавасьці. Па гэткай самай програме—максымум распрацаваны анкеты зьняволеных, а рэшта—па мінімуму.

Трэба яшчэ падкрэсьліць своеасаблівую ў рэлігійных настроях групу людзей, якія хістаюцца між верай і бязбожжам.

Адабрана з усяго матар'ялу 115 анкет, якія даюць правільныя рады фактараў, уплываўшых на зьяўленьне рэлігійнага скепсісу, які падтачыў падставы рэлігійнай веры, але ня прывёў яшчэ прадстаўнікоў гэтай групы да поўнага разрыву з рэлігіяй. Гэтыя анкеты распрацаваны па прычынах, абумовіўшых скепсіс па веку і соцыяльных праслойках, да якіх належаць хісткія ў веры людзі.

Матар'ялы, якія мы публікуем, ахапляюць 3086 распрацаваных анкет. Распрацоўка вялася па 6 асноўных групах: а) масава-самацёчная 1828 чал.; б) соцыяльна-шкодны элемэнт 655 чал.; в) евангэлічная вёска Балочыцы 258 ч.; г) колгасьнікі 146 чал.; д) рабочыя панчошнай фабрыкі ў Віцебску і паперні ў Добрушы 134 ч.; е) навуковыя працаўнікі 65 чал. У далейшых разьдзелах мы падрабязна характарызуем кожную з названых груп і прабуем выявіць цікавячы нас твар яе. Тут-жа зробім толькі некалькі папярэдніх заўваг адносна параўнаньня груп.

Максымальны процант веручых дала група „в", або жыхары заражонай евангэльскім сэктанцтвам вёскі. У гэтай групе веручыя складаюць 71,5%. Сьледам за ёю ідзе група „б", або соцыяльна-шкодны элемэнт. У гэтай групе веручыя таксама ахапляюць больш паловы ўсіх дасьледваных—яны далі 51,4%. Масава-самацёчная група ахапіла асоб, якія паводле свайго соцыяльнага стану характарызуюцца аж 27 катэгорыямі, і паказала процант рэлігійных 28,1. Сярод групы „г"—сялян-колгасьнікаў гэты процант зьніжаецца да 17,8. Для рэшты груп, г. зн. „д"—рабочых і „е"—навуковых працаўнікоў ён даходзіць да мізэрнай велічыні 1,6%.

Сярод масы дасьледваных па ўсіх 6 групах веручых выяўлена 1046 чал., г. зн. 34,6% і няверучых 1968 чал., або 65,4%. Пры гэтым рэзка выяўляецца розьніца ў адносінах да рэлігіі родаў. Амаль ва ўсіх групах процант веручых сярод жанчын вышэйшы, чым сярод мужчын. Для ўсяе масы дасьледваных мы маем тут наступныя паказальнікі: сярод мужчын процант веручых—31, сярод жанчын—44.

Заслугоўваюць увагі даныя, якія сьведчыць аб уплыве веку на рэлігійнасьць. Па ўсіх групах процант веручых зусім законамерна ўзьнімаецца па ўзросных ступенях. Чым старэйшая даная група, тым больш у ёй веручых—і наадварот. Усе дасьледваныя разьбіты намі на 8 узросных разрадаў: I ад 15 да 16 г., II ад 17 да 19, III—ад 20 да 24, IV—ад 25 да 29, V—ад 30 да 39, VI—ад 40 да 49, VII—старэй за 50 год. Наступная табліца навочна паказвае тую законамернасьць, пра якую мы кажам.

| Узросны разрад | Процант бязбожнікаў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Група „а“ | Група „б“ | Група „в“ | Група „г“ | Група „д“ | Група „е“ |
| I | 98,6 | 87,8 | 100 | 100 | — | — |
| II | 93,1 | 73,0 | 53,9 | 100 | 100 | — |
| III | 89,3 | 72,8 | 58,7 | 100 | 100 | 100 |
| IV | 81,0 | 59,2 | 28,3 | 92,9 | 100 | 100 |
| V | 73,5 | 50,0 | 14,8 | 81,8 | 98,0 | 100 |
| VI | 60,0 | 39,0 | 18,9 | 50,0 | 85,7 | 92 |
| VII | 34,3 | 12,3 | 4,5 | 36,3 | — | 100 |

## II.
## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ОБ'ЕКТАЎ ДАСЬЛЕДВАНЬНЯ.

### Група „а“.

Гэта найбольш вялікая з анкетаваных намі груп, ак мы ўжо казалі, дасьледвана, так сказаць, самацёкам. Пры яе дасьледваньні ніякіх пэўных об'ектаў наперад не вызнача-

лася, анкеты сярод насельніцтва распаўсюджваліся без усялякіх зьвязваючых дасьледчыка прадпасылак і адзнак.

Па гэтай групе сабрана больш за 2000 анкет, з іх прыдатнымі для распрацоўкі прызнана 1828.

Табліца № 1 (гл. дадатак) дае ў абсолютных лічбах падрабязную характарыстыку разьмеркаваньня сярод гэтай групы бязбожнікаў і веручых, вызначаючы гэту залежнасьць адносна месца пражываньня дасьледваных (горад, вёска), іх пісьменнасьці, а таксама і роду. Табліца № 2 дае гэтую самую характарыстыку ў процантах.

Адзначаныя табліцы сьведчаць, што процант асоб, якія знаходзяцца пад уладай рэлігіі, вельмі значны. Па ўсёй групе ён складае 28,1%, прычым для мужчынскай часткі анкетаваных ён вызначаецца ў 21,6%, а для жанчын—42,7%, г. зн. амаль удвая большы. Рэзкая мяжа ляжыць таксама між гарадзкім і вясковым насельніцтвам. Для жыхароў гораду процант веручых 14,7, а для вясковых жыхароў 31,1%. Гэта абазначае, папросту кажучы, што калі ў горадзе адзін рэлігійнік прыпадае на 7 апытаных, дык у вёсцы ён прыпадзе на 3. Уплыў пісьменнасьці выяўляецца наступным чынам: процант веручых сярод пісьменных 19,4, сярод няпісьменных 70,3.

Пытаньне аб рэлігійнасьці розных узросных груп характарызуецца табліцамі № 3—у абсолютных лічбах і № 4—у процантах. З іх дакладна вызначаецца законамернасьць адваротнай пропорцыянальнасьці між бязбожжам і ўзростам. Сярод самай малодшай з нашых узросных груп бязбожнікі складаюць 98,6%, сярод самай старэйшай—34,3%. Усе сярэднія групы, якія знаходзяцца між дзьвёх крайніх, падлягаюць той самай законамернасьці—падніманьня на кожную ўзросную ступень цягне зьмяншэньне проценту бязбожнікаў: 98,6%, 89,3%, 81%, 73,5%, 60; урэшце для самай старэйшай групы (звыш 50 год) процант зьніжаецца да 34,3. Гэта законамернасьць выдае сябе як для ўсёй масы дасьледваных па

групе „а“, так і для яе мужчынскай і жаночай падгруп пасобку, што і паказваюць табліцы 3-4.

Фактам, які заслугоўвае вялікае ўвагі, зьяўляецца дынаміка, так сказаць, рэлігійных настрояў і пераконаньняў. Табліцы 5 і 6 даюць у гэтым кірунку матар'ял вельмі значнай вартасьці. Яны паказваюць, што пераважная большасьць няверучых у свой час была веручымі, што ў гэтых людзей у пэўны пэрыод жыцьця прыходзіў пералом ад веры да бязбожжа. У далейшым мы спынім увагу на фактарах, якія абумовілі гэты пералом. Тут-жа затрымаемся толькі на пытаньні аб тым, з якім узростам супадае гэты пералом. Больш за ўсё прыцягвае да сябе ўвагу тая акалічнасьць, што з 164 дасьледваных бязбожнікаў у веку ад 15-16 г. 140, г. зн. 84% яшчэ да 8-гадовага ўзросту былі рэлігійнымі, ці правільней сказаць у адносінах да гэтага ўзросту— рэлігійна выхоўваліся. Гэта лічба заслугоўвае асаблівае ўвагі, бо тут справа датычыць выхаваньня, якое належыць да рэволюцыйнай эпохі, праўда да яе першага пяцігодзьдзя. Для масы дасьледваных бязбожнікаў у веку ад 17 да 30 г. характэрна тое, што веравала: 88% у раньнім дзяцінстве— да 8 год, а 25% парвала з рэлігіяй між 8 і 18 гадамі. Сярод бязбожнікаў ад 30 да 50 год пераважная большасьць, будучы дзяцьмі і падлеткамі, веравала: 91% да 8 год і 53% перажыло пералом у веку ад 8 да 18 год. Урэшце сярод бязбожнікаў вышэй 50 год у дзяцінным і юнацкім веку (да 18 год) веравала 96,6%.

Ад узроснага паказальніку ў сувязі з пераломам я пераходжу да рэлігійнасьці асобных нацыянасьцяй сярод дасьледваных—пытаньне, якое высьвятляецца ў табліцах 7 і 8. З чатырох, найбольш поўна паказаных у матар'ялах нацыянальнасьцяй, максымальны процант веручых далі палякі, сярод якіх анкета дала 44%; амаль аднолькавы процант мы маем сярод вялікарусаў 28,8 і беларусаў—28'5%. На апошнім месцы—яўрэі, рэлігійнасьць якіх вызначана ў 23,6%.

Сувязь між роўнем адукацыі і рэлігійнасьцю дасьледваных характарызуецца наступнымі, якія красамоўна гавораць за сябе, данымі: сярод няпісьменных процант рэлігійных вызначаецца ў 70,3; сярод асоб з хатняй адукацыяй і самавукаў ён складае прыблізна 28,5%; сярод скончыўшых пачатковыя і народныя школы дарэволюцыйнай формацыі ён дае 28,4%; сярод скончыўшых сярэднюю школу 16,6%; сярод скончыўшых савецкую сямігодку 1,2% і ўрэшце сярод асоб з вышэйшай адукацыяй мы маем 2,8% веручых.

Пераходжу да даных, якія высьвятляюць сувязь між социяльным станам дасьледваных і іх адносінамі да рэлігіі (табл. 11). Ня кажучы пра служачых рэлігійнага культу, на першым месцы сярод веручых знаходзіцца група гандляроў (80% рэлігійных); на адным з бліжэйшых да яе месц стаяць сяляне-беднякі (49% веручых) і хатнія гаспадыні (48%). Далей ідуць: пэнсіонэры ды інваліды (37,7%); сялянесераднякі (37,5%); саматужнікі-аднаасобаўцы (35,2%); сяляне, не паказаўшыя характару сваёй гаспадаркі і толькі падкрэсьліўшыя сваю працу ў сельскай гаспадарцы (32%); людзі вольных профэсій (25%); чорнарабочыя (23,1%); беспрацоўныя (23,1%); члены арцеляй (20%). Процант рэлігійных зьніжаецца за 10 у наступных групах: батракі (8,3%), служачыя (5,5%), рабочыя (5,4%). Ён амаль роўны нулю сярод вучняў (0,4%) і роўны нулю сярод настаўнікаў, студэнтаў і чырвонаармейцаў.

Цікава параўнаць гэтыя даныя з данымі, якія датычаць социяльнага пахаджэньня анкетаваных. Найбольш рэлігійнай зьявілася група, паходзячая ад гандляроў. 44% маючых сваё социяльнае пахаджэньне па гэтай лініі зьяўляюцца веручымі, амаль такі самы процант даюць дзеці пэнсіонэраў ды інвалідаў (43%). Далей ідуць групы, паходзячыя ад асоб вольных профэсій (33%), ад служачых рэлігійных культаў (28,6%), ад сялян без вызначэньня характару гаспадаркі (28,3%), сялян-беднякоў (25,2%); сялян-сераднякоў (22%), саматужнікаў (19%), батракоў (13,3%), служачых (12%). Процант

рэлігійных ніжэйшы за 10 далі групы па сваім пахаджэньні ад чорнарабочых (9,6%), рабочых (7,4%) і настаўнікаў (6,6%).

Вялікую цікавасьць маюць даныя, якія паказваюць на ролю розных фактараў у рэлігійнасьці апытаных ці ў іх бязбожжы (табл. 13—14). У гэтым кірунку найбольш дзейным фактарам зьяўляецца бязумоўна школа. Досыць сказаць, што 45% усіх апытаных адзначаюць школу, як фактар, меўшы ўплыў на іх рэлігійныя ці антырэлігійныя пераконаньні. У якім кірунку ішоў уплыў гэтага фактару? 53,6% адказаў паказваюць, што школа дапамагала веры, накіроўвала анкетаванага ў бок рэлігіі і 46,4% адказаў прызнаюць школу фактарам атэістычным, асноўнай прычынай, абумовіўшай бязбожжа дасьледваных. Для разуменьня гэтай акалічнасьці трэба мець на ўвазе, бязумоўна, акалічнасьць, добра выяўленую пры вывучэньні анкет з адказамі першага і другога роду. Школа, як фактар рэлігіі, у пераважнай большасьці фігуруе ў анкетах асоб старэйшых узростаў, г. зн. выхаваных у царкоўнай школе, а як фактар бязбожжа—у анкетах асоб малодшых узростаў, або выхаваных у савецкай школе. Вельмі прыметную ролю пры выяўленьні фактараў, зрабіўшых рашучы ўплыў на рэлігійныя пераконаньні і настроі дасьледваных адыгрывае „асяродзьдзе“, пад якім разумеюць бліжэйшае сваяцкае, сямейнае, іншы раз тварыскае абкружэньне. Такія спасыланьні на „асяродзьдзе“ мы маем у 15% усіх анкет. Пры гэтым выяўляецца вялізная рэакцыйная роля гэтага так званага „асяродзьдзя“—у 93,1% выпадкаў яно накіроўвала дасьледваных у бок рэлігіі і толькі ў 6,9% цягнула ад рэлігіі да бязбожжа. Чытаньне мастацкай літаратуры, спасыланьне на што ёсьць у 10% адказаў, у 1/3 выпадкаў спрыяла рэлігійнасьці анкетаваных, а ў 2/3 выпадкаў—абумаўляла іх атэізм. Сельская гаспадарка ва ўсіх анкетах, дзе на яе паказваюць, як на фактар, меўшы ўплыў на рэлігійнасьць, прызнаецца спрыяючай рэлігійнасьці, выклікаючай веру ў бога (100%). Адначасна трэба падкрэсьліць, што батрацтва ў ролі, спрыяючай рэлігійнасьці, успамінаецца

толькі ў 18,5%, а ў 81,5% пра яго кажуць, што яно ўздымала супроць рэлігіі, зьнішчала веру ў бога і г. д. Праца ў прамысловасьці спрыяла рэлігійнасьці ў нязначнай меншасьці апытаных (6,7%), а для пераважнай большасьці (93,7%) гэта праца была магутным фактарам бязбожжа і антырэлігійнасьці.

Да гэтага канечна трэба далучыць даныя па пытаньні аб тым, якая прычына выклікала пераварот у думках і сьветапоглядзе людзей, некалі быўшых рэлігійнымі, а цяпер бязбожнікаў. Нашы даныя сьведчаць аб тым што першае месца ў радзе гэтых прычын займаюць антырэлігійная агітацыя і прапаганда, на што спасылаюцца 22,1% асоб, страціўшых веру (табл. 16). Таксама вялікі ўплыў літаратуры, пад якою разумеюць ня толькі спэцыяльна антырэлігійную, але і гістарычную, популярна-навуковую, вельмі часта мастацкую. Спасыланьне на літаратуру мы маем у 21,6% анкет гэтай групы. 19,5% анкет паказваюць на здабытыя навуковыя веды аб сьветабудове, як на асноўны факт, адцягнуўшы дасьледваных ад рэлігіі. Вельмі важна ў гэтым кірунку і роля асабістых перажываньняў, тых ці іншых падзей асабістага жыцьця, эмоцыянальнага фактару ў яго самых рознастайных праявах. Да эмоцыянальнага фактару апэлююць 14,7%. Пад уплывам імпэрыялістычнай вайны схілілася да бязбожжа 3,2%, грамадзянскай вайны і рэволюцыі—10,8%.

З іншых даных анкет заслугоўваюць увагі весткі аб адносінах дасьледваных да абрадавасьці (гл. табл. № 15). 11,5% веручых ня выконваюць абрадаў. Мотывуецца гэта з большага прычынамі об'ектыўнага парадку — адсутнасьцю часу, магчымасьці і г. д. Больш паказальны той факт, што сярод прызнаючых сябе бязбожнікамі ёсьць каля 2% выконваючых абрады. Тут мотывамі зьяўляюцца навычкі, традыцыя і націск асяродзьдзя.

Урэшце спынімся на пытаньні анкеты, як уяўляе сабе веручы бога (табл. 17 і 18). Каля $^1/_3$ апытаных на гэты

пункт адказу не дало. 17,1% адказала, што ня мае адпаведных уяўленьняў, прычым цікава, што процант так заявіўшых сярод пісьменных вышэйшы (19,3%), чым сярод няпісьменных (13,8%). Наогул уяўленьні аб богу больш конкрэтныя, выпучаныя, прымітыўныя і аднастайныя сярод няпісьменных. Адказы няпісьменных на гэта пытаньне можна рубрыкаваць на 8 разрадаў, адказы пісьменных патрабуюць 18 разрадаў. Адзін з найбольш частых адказаў на пытаньне аб уяўленьні боства кажа: „у выглядзе духу“ (12,8%), далей ідуць адказы: „усемагутны“ (5,9%), „звыш-чалавек“ (5,3%), „уладар сьвету“ (5,5%), „так, як яго малююць, на абразох“ (5,7%), „творца сьвету“ (3,9%), „нябачная сіла“ (3,17%), „звыш-прыродная сіла“ (1,8%), „усё жывое“ (1%) і г. д.

Вось асноўныя схэматычныя даныя, якія характарызуюць рэлігійнасьць групы „а“. Гэтыя даныя будуць прааналізаваны намі ніжэй разам з разглядам адпаведных даных аб дасьледваных другіх груп.

## Група „б“.

Групу „б“ складаюць, як мы ўжо казалі пры агульнай характарыстыцы об'ектаў нашага дасьледваньня, 655 асоб, пазбаўленых волі. Такім чынам, гэта група спэцыфічная— яе складае соцыяльна-небясьпечны элемэнт. Проблема рэлігійных настрояў антыграмадзянскага элемэнту, людзей, якіх пролетарская дзяржава вымушана была ізоляваць ад грамадзтва, асоб, якіх савецкая ўлада прызнала за канечна патрэбнае перавыхаваць працоўна-папраўчымі мерапрыемствамі,—гэта проблема зьяўляецца новай і цікавай задачай, якая стаіць перад кожным дасьледчыкам сучаснай рэлігійнасьці. Сабраныя намі па гэтым пытаньні даныя разьмешчаны ў 15 табліцах у канцы гэтай працы (№№ 19—33). Тут мы абмяжуемся кароткай характарыстыкай гэтых даных.

Процант веручых па групе „б“ значна вышэйшы як у іншых групах. Ён вызначаецца анкетай у 51,4%. Такім чынам, большая частка насельнікаў Папраўчага Дому,—асоб,

парушыўшых законы савецкай дзяржавы, пераступіўшых нормы грамадзкасьці, якая разьвіваецца пры пролетарскай дыктатуры, — хоча жыць у паслушэнстве боскім законам. Няма нічога дзіўнага ў гэтай зьяве. Як у свай час заўважыў Пляханаў, тыя, хто заблудзіў у небе, шукаюць дарогу на неба. Больш падрабязна пра значэньне гэтага факту мы скажам ніжэй.

Асаблівай рысай гэтай групы ёсьць тое, што рэлігійнасьць у ёй мужчын вышэйшая за рэлігійнасьць жанчын (у мужчын 53,2%, у жанчын 39,5%). Гэта значнае адхіленьне ад суадносін, якія мы маем для ўсяе масы дасьледваных. Уплыў на рэлігійнасьць пазбаўленых волі такіх паказальнікаў, як жыцьцё ў горадзе ці вёсцы і пісьменнасьць, у групе „б“ выяўляецца менш прыкметна чым у іншых групах. Так, процант веручых для жыхароў гораду вызначаецца для гэтай групы ў 38,1, для вяскоўцаў у 54,3. Сярод пісьменных гэты процант складае 47,3, сярод няпісьменных 63,8. Тут, як мы бачым, дае сябе адчуваць тая самая тэндэнцыя, што і ў іншых групах, але яна выяўляецца тут у параўнаўча слабым выглядзе.

Рэлігійнасьць розных узросных груп сьцьвярджае тую самую законамернасьць адваротнай пропорцыянальнасьці між бязбожжам і ўзростам, якую паказваюць анкеты ўсіх без выключэньня груп (табл. 21 і 22). Сярод самага малодшага ўзросту зьняволеных % веручых вызначаны ў 13,3, сярод самага старэйшага — у 87,7%. Сярэднія групы між гэтымі крайнімі таксама паказваюць, што кожная сьледам ідучая ўзросная ступень (апрача аднаго нязначнага адхіленьня) дае павялічэньне проценту бязбожнікаў: 86,7%, 82,8%, 60%, 50,5%, 38,2%, 12,3%.

Рэлігійнасьць асобных нацыянальнасьцяй па групе „б“ наступная: палякі—66%, вялікарусы—66%, беларусы—53%, яўрэі—52% (табл. 25).

Адносна сувязі між адукацыйным роўнем і рэлігійнасьцю тут можна сказаць тое самае, што мы сказалі пра

ўплыў на рэлігійнасьць месца пражываньня і пісьменнасьці: у наяўнасьці ёсьць тая самая тэндэнцыя, як і ў іншых групах дасьледваных, але яна выяўляецца ў куды слабейшай форме. Так сярод няпісьменных % веручых вызначаецца ў 63,8; сярод асоб з хатняй асьветай і самавукаў ён складае 55; сярод скончыўшых пачатковыя і народныя школы дарэволюцыйнай формацыі ён дае 40,5; сярод скончыўшых савецкую сямігодку 13%; сярод асоб з вышэйшай адукацыяй 15%.

Даныя аб соцыяльным стане веручых па групе „б" даюць малюнак, прыкладам, такі самы, што і ў іншых групах, але без такіх рэзкіх адзнак, як у іх.

Паводле процанту веручых асобныя соцыяльныя праслойкі зьняволеных разьмяркоўваюцца так: служачыя культаў (100%), хатнія гаспадыні (100%), дэклясаваны элемэнт (80%), сяляне-беднякі (80%), сяляне без вызначэньня велічыні гаспадаркі (64%), сяляне-серадднякі (50%), гандляры (62,5), настаўнікі (45%), рабочыя (40%), саматужнікі (38%), чорнарабочыя (36,8%), батракі (25%) і г. д. (гл. табл. 27). У гэтым радзе асаблівую на сябе ўвагу зьвяртае вялікі процант веручых сярод настаўнікаў, тым часам як у іншых групах ён нязначны.

Даныя аб соцыяльным пахаджэньні веручых, пазбаўленых волі, ня маюць цікавасьці ў сэнсе адрозьненьня ад даных, выяўленых у гэтым пытаньні для іншых груп. А дзеля таго мы на гэтым тут ня спыняемся, адсылаючы зацікаўленых да табл. № 28.

Пераходжу да фактараў, абумовіўшых рэлігійнасьць ці бязбожжа апытаных. Сярод пазбаўленых волі на школу, як фактар, які ўплывае на рэлігійныя настроі, спасылаюцца 155 асоб, або 23,6%. Такім чынам, сярод гэтай групы мы маем такі самы значны ўплыў школы, як і сярод іншых груп. Пры гэтым цікава, што 84,1% адказаў падкрэсьліваюць *тэолёгічны* і 15,9% *атэістычны* ўплыў школы. На асяродзьдзе і бліжэйшае абкружэньне спасылаецца 16%,

прычым 67,6% адказаў падкрэсьліваюць тэолёгічны і 32,4% атэістычны ўплыў гэтага фактару. Пра літаратуру кажуць, як пра фактар, які накіраваў думку ў бок рэлігіі 48% адпаведных адказаў, а 52% прызнаюць, што літаратура штурхала іх на адыход ад рэлігіі. Аб сельскай гаспадарцы ў 100% адказаў мы маем прызнаньне ўплыву яе ў бок рэлігіі. Варта ўвагі тое, што ў адзнаку ад іншых груп, у гэтай групе ёсьць 67% зазначэньняў на працу ў прамысловасьці, як на фактар, спрыяючы разьвіцьцю рэлігійных сьветапоглядаў.

Бязбожнікі групы „б“ прычынамі, якія выклікалі ў іх перalом ад веры да бязбожжа, часьцей за ўсё прызнаюць асабістыя перажываньні (34%), рэволюцыю (25,7%), антырэлігійную агітацыю і пропаганду (17%), знаёмства з навукай (8,3%), службу ў чырвонай арміі (2,7%).

Адначасна адзначым, што некаторыя з веручых, перажыўшых пералом ад бязбожжа да веры, спасылаюцца на рэволюцыю (2) і зьняволеньне (2), як на непасрэдныя прычыны пераходу да веры.

У канцы характарыстыкі групы хачу яшчэ дадаць, што сярод звычайных, не адасобленых ад пашыраных у іншых групах уяўленьняў бага, зьняволеныя часта маюць уяўленьні аб богу, як аб „збаўцы“. Знайсьці прычыны такога ўяўленьня, бязумоўна, ня цяжка...

## Група „в“.

Другі Ўсесаюзны Зьезд Бязбожнікаў правільна завастрыў увагу на канечнай патрэбе дакладнага вывучэньня сэктанцтва, як адной з асноўных прадпасылак барацьбы з гэтым „тонкадэмагогічным відам рэлігійных доктрын“.

Прымаючы пад увагу значнае пашырэньне сэктанцтва ў БССР, мы прызналі мэтазгодным адным з об‘ектаў нашага дасьледваньня вылучыць вёску, моцна закранутую сэктанцтвам. Мы лічылі, што дасьледваньне такога „сэктанцкага гнязда“ і параўнаньне атрыманых даных з вынікамі

дасьледваньня іншых об'ектаў будзе мець значную цікавасьць і зможа даць нам патрэбны матар'ял для правільнага разуменьня сэктанцкіх настрояў.

З гэтай прычыны мы зрабілі дасьледваньне в. Балочыцы, вядомай як апорны пункт евангэлістых у БССР.

В. Балочыцы знаходзіцца на паўднёвым захадзе Слуцкага раёну. У царскія часы яна гібела ад безьзямельля і галечы насельніцтва, якое ў значным процанце эміґравала ў Амэрыку, ішло на фабрыкі і заводы, наймалася парабкамі ў панскіх дварох графа Завадоўскага ды інш.

У сучасны момант вёска мае 269 індывідуальных гаспадарак, пераважна бядняцкіх. У культурных адносінах в. Балочыцы—адзін з самых далёкіх куткоў Беларусі. Звыш паловы насельніцтва няпісьменныя. Мясцовы настаўнік тав. Завістовіч, арганізаваўшы нам збор анкет, паведамляе, што вёска вызначаецца п'янствам і распустай. „Я думаю,— піша ён,— што ва ўсёй Беларусі ня п'юць так, як у в. Балочыцах". Знаходзіцца Б. побач з вёскамі вельмі заражонымі сэктанцтвам.

Мы атрымалі і распрацавалі па Балочыцах 268 анкет, склаўшых групу „в" нашага дасьледваньня (табл. №№ 34—37).

Група „в" дала максымальны процант рэлігійнасьці— 1,75/⁰/₀, прычым сярод жаночай часткі апытаных гэты процант дасягае 93,3. Гэты выключна высокі процант рэлігійнасьці сьведчыць, што кваліфікацыя сэктанцтва, як аднэй з найбольш небясьпечных утончана-„рафінаваных" форм рэлігійнага прывабліваньня душ у савецкіх умовах, не зьяўляецца перавялічанай. Аб гэтай утончанасьці сьведчыць і той факт, што амаль усе апытаныя старанна маскавалі сваю прыналежнасьць да сэкты евангэлістых. На пытаньне: „ці належыце вы да якой-небудзь з існуючых сэкт?"— няўхільна давалася кароткае „не" або на пытаньне проста не давалася адказу, яно „змазвалася".

Для характарыстыкі групы „в" тыпова, што ў ёй асноўнымі фактарамі, якія абумаўляюць рэлігійныя пераконаньні

дасьледваных, адзначаюцца: заняткі сельскай гаспадаркай, уплыў асяродзьдзя і школа. Згодна з анкетамі гэтай групы, праца ў сельскай гаспадарцы ва ўсіх 100% паказана фактарам тэолёгічным, таксама ў 100% уплыў асяродзьдзя цягнуў у бок рэлігіі; што да школы, дык яна ў 76,3% спрыяла рэлігійным настроям і пераконаньням апытаных і толькі ў 23,7% нішчыла гэтыя настроі.

Адносна ўяўленьняў евангэлістых аб богу трэба адзначыць, што гэтыя ўяўленьні таксама прымітыўныя, аднастайныя, як і ўяўленьні прыхільнікаў праваслаўнай, юдзейскай ці каталіцкай рэлігій (гл. табл. № 37). Тут фігуруюць тыя самыя заявы аб „духу“, „звыш-прыроднай сіле“, „уладару сьвету“, „творцы сьвету“, з якімі мы сустракаліся ўжо ў іншых групах.

Дасьледваньне, зробленае ў Балочыцах, паказала, што сэктант ня толькі веручы чалавек, але і ваяўнічы рэлігійнік. Гэты ваяка-рэлігійнік шмат дзесяткаў анкет запоўніў патрабаваньнямі паддацца рэлігіі, прызнаць евангэлічную веру, пагрозамі на адрас зраднікаў. „Убойтесь бога и воздайте ему, ибо наступит час суда его, и поклонитесь сотворившему небо и землю, море и источники“ (з анкеты 45-гадовага евангэлістага). „Образумьтесь и поклонитесь всемогущему создателю, ибо близок час второго пришествия христова“ (з анкеты 53-гад. евангэлістага, гордага тым, што „6 год таму назад ён зразумеў сьвет праўды, усьвядоміў сьвятое евангэльле“). Такімі заклікамі перапоўнены анкеты балочыцкіх сэктантаў. Кулацкая падкладка і контр-рэвалюцыйная сутнасьць усіх гэтых заклікаў выразна выяўлена самімі аўтарамі анкеты, якія „сумуюць“, што „цяпер людзі забыліся на бога, за што прышла ўся бяда і гора“, якія заяўляюць, што „праз колектывізацыю надыходзяць апошнія дні, бо спаўняецца евангэльскае прароцтва аб зьверы, якому імя 666“, якія раюць прадстаўніком савецкай улады „лепш падумаць аб ратаваньні сваіх душ, чым займацца раскулачваньнем і адбіраньнем цэркваў ад народу“.

На гэтым твары евангэлістага-ваяўнічага рэлігійніка мы яшчэ спынім сваю ўвагу ў адпаведным месцы III разьдзелу нашай працы.

### Група „г".

Колектывізацыя сельскай гаспадаркі зьяўляецца найвялікшым атэістычным фактарам. Пераход шматмільёнай дробнай і найдрабнейшай індывідуальна-ўласьніцкай гаспадаркі на рэйкі колектывізацыі, пераробка яе ў буйную колектыўную і тэхнічна ўзброеную цягне за сабой разрыў шырачэзных мас сялянства з тымі рэлігійнымі забабонамі, у палоне якіх трымала іх індывідуалістычная сельская гаспадарка з яе нявольніцкай паслухмянасьцю стыхіям прыроды, з яе прытупляючым характарам працы. Ужо ў аглядах матар'ялаў па рэлігійных групах нашага дасьледваньня мы бачылі, на якім моцным ланцугу падуладнасьці рэлігійным фэтышам трымае селяніна сельска-гаспадарчая праца, што выконваецца ў умовах дробнага ўласьніцтва, мізэрнай беспараднасьці перад усемагутнай прыродай і эксплёатацыі з боку паразытычнай верхавіны вёскі. Сельска-гаспадарчая колектывізацыя, разам з якой ідзе тэхнічнае ўзброеньне, пераводзіць хлеб з продукту „зямлі і поту" ў продукт „мэталю і хэміі", рве гэты іржавы ланцуг традыцыйнай пакорлівасьці селяніна рэлігіі.

Наша дасьледваньне дае ў гэтым кірунку надзвычай паказальны матар'ял. Ня гледзячы на тое, што група дасьледваных колгасьнікаў у кола колектывізацыі ўцягнута параўнача нядаўна, прыкладам, на працягу году, яна ўсё-ткі дэмонстравала масавы разрыў з рэлігіяй.

Процант рэлігійных сярод дасьледваных намі калгасьнікаў вызначаны ў 17,8%. Усё значэньне гэтай лічбы будзе зразумела, калі параўнаць яе з тым, што вызначаны нашай анкетай па групе „а" процант рэлігійных сярод сялян не колгасьнікаў хістаецца між 32 і 49.

Рэзкая розьніца між групай колгасьнікаў і сялянамі, дасьледванымі па іншых групах, выяўляецца ў тым, што ў колгасьнікаў малодшыя ўзросты зусім пазбаўлены рэлігійнай хваробы. Уражаньне робіць факт, што сярод усіх дасьледваных колгасьнікаў да 20 год ня выяўлена ніводнага веручага (гл. табл. № 38).

Для ўзросту ў 20—30 г. гэты процант мізэрны (4,1%), ад 30 да 40 г. вельмі нязначны (20,2%), значную велічыню ён дае толькі для колгасьнікаў у ўзросьце звыш 40 год, ад 40 да 50 г.—50% і звыш 50 год—64,7%.

Такім чынам, самая старая частка колгасьнікаў яшчэ была няздольнай разарваць з рэлігіяй, але калгасная моладзь цалкам атэістычная.

### Група „д“

Гэта група найбольш бязбожная з усіх дасьледваных намі. Гэта зусім натуральна, бо склад групы—рабочыя 2 беларускіх фабрык—паперні ў Добрушы і панчошнай у Віцебску.

Мы ўжо, характарызуючы масавы матар'ял па дасьледваньні групы „а“, а таксама іншых груп, бачылі, што процант рэлігійных сярод рабочых мінімальны (5,4%). Вылучэньне дзьвёх цэлых рабочых груп у якасьці спэцыяльных об'ектаў дасьледваньня выявіла яшчэ значна меншы процант рэлігійных сярод рабочых. Наша дасьледваньне, такім чынам, дае яшчэ адно экспэрымэнтальнае, так сказаць, сьцьвярджэньне даўно формуляванай марксызмам тэзы аб тым, што пролетарыят атэістычны па сваёй клясавай прыродзе. Мы ведаем, што самы вытворчы процэс, удзельнікам якога зьяўляецца пролетарыят, процэс, у якім гэты пролетары прывучаецца выступаць як актыўны, дзейны пераможца прыроды, што гэты процэс робіць сьветапогляд рабочага бязбожным. Стварыцель-вытворца, уладар рэчаў, але ня іхны нявольнік,—пролетары ня ўжываецца з нявольніцкай псыхолёгіяй, уласьцівай кожнай рэлігіі. Сьвядомы пролетары ве-

дае цану і клясавую ролю рэлігіі, як аднаго з магутных вагароў ідэолёгічнага зьняволеньня эксплётаваных мас. Вось чаму кожны сьвядомы пролетары—стыхійны атэісты. „Сучасны сьвядомы рабочы, выхаваны буйнай фабрычнай прамысловасьцю, адукаваны гарадзкім жыцьцём, адкідае ад сябе з пагардай рэлігійныя забабоны, аддае неба ва ўладу папоў і буржуазных сьвятош, заваёўваючы сабе лепшае жыцьцё тут, на зямлі“. І нездарма бэрлінскі пастар Густаў Дэн, дасьледваўшы ў 1923 г. рэлігійныя настроі нямецкай пролетарскай моладзі, быў вымушаны, публікуючы вынікі сваіх досьледаў, сумна заявіць: „Як толькі гэтыя людзі даведаюцца, што яны зьяўляецца кавалкам тавару (рабочая сіла) у вялікім гаспадарчым процэсе капіталізму, тады рэлігія для іх проста ня існуе. Лёс пролетарыя--страціць сваю рэлігію“.

Анкета паказвае, што наш рабочы ня толькі ня верыць але што ён і ваяўнічы бязбожнік. Вось чаму праз радкі яго адказаў прабіваецца баявы атэістычны запал, абумоўлены разуменьнем эксплёататарскай у савецкіх умовах контр-рэволюцыйнай ролі рэлігіі. Так, напр., 30 г. рабочы Добрускай фабрыкі заяўляе:

„У мяне быў таму пералом, што я чытаў і пераканаўся ў адсутнасьці бога, а цяпер я хачу, каб Вы павялі сярод нас дасканалую работу, якая скруціла-б галаву ўсёй рэлігіі. З гэтай мэтай няхая цэнтральны савет бязбожнікаў і акадэмія дадуць культсілы для нас і мы на працягу пэўнага часу хоць моладзь адцягнем. А царкву абавязкова пад школу“.

Вялікую цікавасьць выклікае ў нас наступная заява, якая прыкладзена да адной анкеты з Добрускай фабрыкі і сьведчыць аб баявым антырэлігійным настроі нашай пролетарскай моладзі:

„Мы дваццаць чалавек ніколі ў бога ня верылі і ня верым, дзеля таго анкету і не запаўняем,—рабочая моладзь, хлопцы і дзяўчыны. Просім толькі давесьці папу рымскаму, што ў нас няма прыгнёту рэлігіі, і па анкетах падлічыце,

колькі і хто ня верыць і апублікуйце гэта ў газэтах,—інакш мы ня будзем ведаць аб выніках работы, што зьнізіць і ваш аўторытэт—акадэміі ў нашых вачох“.

Характэрна, што вялізная большасьць групы „г“ атэістычна з раньняга маленства. Толькі 33,3% дасьледваных верыла да 8 год і 12,9% да 18 год.

Вельмі добра высьвятляе прычыну гэтай зьявы адна работніца Віцебскай панчошнай фабрыкі, якая піша: „Верыць у бога мяне ніхто не прымушаў. Матцы ня было калі, яна зраньня да начы працавала, бабкі ня было, бацька быў вартаўніком на Р. А. чыгунцы, я вучылася ў лютаранскай школе, дзе вучыць закон божы было неабавязкова. А таму вельмі мала разумела пра бога... Абрадаў ня выконвала, у царкве ня брала шлюбу і дзяцей ня хрысьціла“. Гэты адказ тыповы паказальнік тых абставін, у якіх іншы раз выраслі патомныя пролетары, дзяцінства якіх ня было атручана рэлігіяй.

Тут трэба яшчэ сказаць, што і ў адказах рабочых падкрэсьліваецца роля школы, як фактару рэлігійнасьці. У 71,5% тых адказаў гэтай групы, дзе ўспамінаецца пра школу, аб ёй кажуць, што яна штурхала ў бок рэлігіі, і толькі ў 28,5% ёй прыпісваецца процілеглая роля. У адзнаку ад усіх іншых груп уплыў асяродзьдзя ў групе „д“ быў выключна атэістычны (100%). Тое абкружэньне, у якім вырастае і працуе пролетары, не дазваляе яму заставацца ў палоне рэлігіі. Націск пролетарскай грамадзкай думкі, наадварот, вымагае рашучага разрыву з гэтай фальшывай, клясава-варожай ідэолёгіяй.

## Група „е“

Гэта група спэцыфічная. Яна ахапляе сабой навуковых працоўнікаў. Проблема рэлігійных настрояў кваліфікаванай верхавіны інтэлігенцыі мае вельмі значную цікавасьць.

З першага погляду можа здавацца, што самы факт работы прадстаўнікоў гэтай групы ў галіне навукі, тая акалічнасьць, што навука зьяўляецца, так сказаць, іх вытворчасьцю, ужо

вызваляе іх з-пад улады рэлігіі. І сапраўды, навука—найбольш дзейны сродак супроць рэлігійнага наркозу. Навука—магутная і пераможная сіла ў барацьбе з рэлігіяй. Яна ў корані зьнішчае абстрактныя, містычныя настроі. Яна веры і догме проціставіць — веды і шуканьне. Здаецца, што працаўнікі навукі з прычыны свайго вытворчага стану павінны былі быць рашучымі і бязумоўнымі ворагамі рэлігіі. Але гэтак бывае далёка не заўсёды. Дасыць часта заўважаюцца выпадкі, калі асобныя навуковыя працаўнікі, іншы раз нават вялікія вучоныя, выступаюць у ролі абаронцаў рэлігіі, яе прыхільнікаў і апалёгэтаў. З гэтага боку цікава сабраная перад вайной ангельскім місіянэрам Табрумам колекцыя заяў выдатных ангельскіх і амэрыканскіх вучоных канца XIX, пачатку XX ст., дзе гэтыя олімпійцы буржуазнай навукі літаральна расьпінаюць сябе за рэлігію, за яе права існаваць побач з навукай, за канечную патрэбу яе аб'яднаньня з навукай і г. д. і г. д. У сучаснай капіталістычнай Эўропе шмат буржуазных вучоных таксама вельмі старанна імкнуцца пракласьці мост ад навукі да рэлігіі. У сучасны момант мы наглядаем сапраўдны блёк буржуазнай навукі з рэлігіяй, яўную пярэклічку часткі эўропейскіх вучоных з папоўствам [1]).

Прычыны гэтай з першага погляду супярэчнай зьявы,—імкненьня злучыць нязлучальнае—выкрываюцца без асаблівай труднасьці. Вучоныя ня жывуць у соцыяльнай торычэлевай пустэчы. Яны гадуюцца і працуюць у клясавым грамадзтве, яны зьвязаны шматлічнымі ніткамі з той ці іншай клясавай групоўкай. Большасьць вучоных у капіталістычных краінах зьвязяна з эксплёататарскімі клясамі, з тымі клясамі, чые інтарэсы ўладарна вымагаюць культываваньня рэлігіі. Ня цяжка выкрыць і клясавую подшыўку рэлігійных настрояў той часткі савецкіх вучоных, якія ня прынялі Кастрычніка і апынуліся ў белагвардзейскай эміграцыі ці засталіся ў Саюзе „ўнутранымі эмігрантамі". Вельмі яскрава формуляваў настроі гэтай

[1]) Пра гэты блёк больш падрабязна ў маім арт. „Наука і борьба классов", ВАРНИТСО. 1930. № 2.

часткі навуковых працаўнікоў той адзіны, хто з усіх апытаных намі па групе „е“ прызнаў сябе прыхільнікам рэлігіі. І вось характэрна, што гэты богалюбны вучоны паведаміў, што ён у мінулым бязбожнік і да рэлігіі прышоў пад уплывам рэволюцыі, бо пераканаўся, што рэлігія „адзіная сіла, якая здолее стрымаць масу на роўні мінімальных маральна-этычных прынцыпаў“...

Наша анкета вызначыла процант бязбожнікаў сярод навуковых працаўнікоў у 98,5%. На падставе доўгага і блізкага знаёмства з навуковымі коламі БССР я схільны лічыць гэты процант перавялічаным з прычыны таго, што, відаць, некаторыя веручыя навуковыя працаўнікі ад запаўненьня анкеты ўхіліліся.

Сярод вынікаў дасьледваньня заслугоўвае ўвагі тое, што ў 69,2% няверучых вучоных верыла да 8 год і 12,3% да 18 год (табл. № 45). Аб уплыве школы на рэлігійны сьветапогляд ёсьць спасыланьне ў 53% усіх анкет, пры гэтым надта важна, што ў 71,4% выпадкаў пра ролю школы кажуць, як пра фактар, які замацоўвае веру, культывуе рэлігію.

Як самы важны і асноўны фактар, абумовіўшы адыход ад рэлігіі, у 68,2% анкет гэтай групы прызнаецца навука Як відаць, дэтэолёгізуючая сіла навукі, пра якую мы казалі вышэй, часта перамагае самыя вялікія перашкоды, якія стаяць на шляху вучонага да бязбожжа. Цікава, што рэволюцыя, як фактар атэізму, прызнаецца ў невялікай колькасьці анкет (3%).

III.

## РЭЛІГІЙНЫЯ ЎЯЎЛЕНЬНІ ВЕРУЧЫХ.

У першым разьдзеле мы ўжо казалі пра тое, што рэлігійныя ўяўленьні дасьледваных намі веручых вельмі прымітыўныя. Мы адзначалі пры гэтым, што ўяўленьні пісьменных больш дыфэрэнцыяваны чым няпісьменных. У першых нам трэба было дыфэрэнцыяваць уяўленьні па 18 рубрыках, для другіх досыць было 8. Ня гледзячы на гэту розьніцу

ў дыфэрэнцыі рэлігійных уяўленьняў яны глыбака прымітыўныя. Амаль усе адказы веручых сходзяцца да таго, што рэлігійная вера абумаўляе прызнаньне творца сьвету і яго кіраўніка. Пераважная большасьць мысьліць гэтага творцу зусім па-паганску—яму надаюць чалавечыя атрыбуты, а іншы раз яго ўяўляюць фантастычным стварэньнем з усялякімі мітычнымі ўласьцівасьцямі. Адказы веручых адносна іх уяўленьняў бога характарызуюцца вялікай трафарэтнасьцю.

Асноўны штамп гэтых уяўленьняў: „усемагутны ўладар", „творца ўсяго, што ёсьць", „звыш-прыродная сіла", „звышчалавек", „сьвяты дух". Часты і такія вызначэньні боства: „гаспадар сьвету", „сіла, якая ўсё стварае і ўсё зьнішчае", „нябачная сіла", „бесьцялесны дух", „мздовоздаятель, который всякому воздает по делам его", „сіла, якая стварае ўсё, што бачым і чаго ня бачым", „найвышэйшая сіла ў прыродзе, ад якой залежаць усе жывыя стварэньні", „высока-гуманітарная сіла, якая карае гвалт, цынізм і грубасьць", „усемагутны, усямоцны чалавек, які кіруе ўсім сьветам".

Некаторыя з адказаў маюць зусім дзікунскі характар:

„Мысьлю бога, як старога дзеда, які кіруе нябескай канцылярыяй" (63 г. селянін, скончыўшы народную школу), „бога ўяўляю сабе, як ціхага галуба" (35 г. селянка, няпісьменная), „бог-дух, на скрыдлах лётаючы над зямлёй" (шавец 48 г. малапісьменны), „бога бачу, як вялікага воя" (чорнарабочы 27 г., малапісьменны) і г. д. Для дасьледваных зьняволеных характэрны частыя ўяўленьні бога, як „збаўцы" і „выратаўца". Некаторыя з уяўленьняў аб богу маюць адбітак яскравай сэксуальнай дэтэрмінаванасьці. Так, жанчына 31 г., з сярэдняй адукацыяй, хатняя гаспадыня ўяўляе сабе бога „самавітым, чароўным юнаком", другая жанчына 42 г., савецкая служачая, кажа пра бога, як пра „прыгожага кавалера", урэшце мы маем адказ 36 гадовай жанчыны—касіра, якая дае парнаграфічную формулёўку свайму сэксуальна-абвостранаму ўяўленьню бога.

Асобную групу адказаў даюць анкеты, аўтары якіх імкнуцца замяніць рэлігійную веру містычнымі „настроямі". Аўтары анкет заяўляюць, што ў бога ня веруць, рэлігіі ня прызнаюць, але тут-жа дадаюць, што адчуваюць у сабе веру ў нейкую надзвычайную істоту, якая кіруе сьветам. Так малапісьменны селянін 66 г. кажа: „Рэлігіі не прызнаю, у афіцыйнага бога ня веру, але прызнаю вышэйшую ў сьвеце сілу, вялікую, якая жыве ва ўсёй прыродзе, у кожным чалавеку... мае рэлігійныя настроі ў маёй душы і сэрцы". 18 г. батрак, скончыўшы 5 клясаў 7-годкі, піша: „Ня верыў і ня буду верыць, але ўсё-ткі нешта надпрыроднае адчуваю, што кіруе ўсёй стыхіяй". Некаторыя з анкетаваных, рашуча кажучы супроць поўпаганскіх праяў рэлігійнага фанатызму і экзальтацыі, разрываюць з абрадавай часткай рэлігіі і свой сьветапогляд накіроўваюць у бок абстрактнага сьвету, этыка-містычнага самаўдасканаленьня і „набліжэньня" да боства... Так, адзін выхадзец з сялян 26 г. з вышэйшай адукацыяй, які на пытаньне аб родзе заняткаў адказаў: „сталых ня маю", такім чынам ахарактарызаваў свой сьветапогляд: „у рэлігіях я прызнаю тую вартасьць і схіляюся перад тым, што зьяўляецца прычынай аб'яднаньня ўсіх людзей... Рэлігійныя настроі выліваюцца ў форму ўнутранага самаўдасканаленьня, як канечна патрэбнай умовы для павышэньня моральнага роўню"... Ён лічыць, што „рэлігія можа даць людзям тое, чаго яны ніяк не атрымаюць ад навукі, і што выключна рэлігія стварае спрадвечнае дабро". Другія містыкі дарэмна імкнуцца разлучыць паняцьці рэлігіі і бога. Яны не прызнаюць рэлігіі, але пакорлівы богу. „Рэлігію прызнаю маною, а веру ў бога прызнаю", піша селянін 41 г., які скончыў гарадзкое вучылішча і знаходзіцца ў Папраўчым доме. „Усялякая рэлігія павінна быць зьнішчана, як контр-рэволюцыйная, але бога, як магутную і добрую сілу, трэба прызнаваць" (настаўнік 35 г. з Воршы). Тыя з дасьледваных, што замяняюць культава-абрадавую рэлігію рэлігійным філёзофаваньнем ці маралізаваньнем містычнага характару, як відаць

з анкет, лічаць сябе ўзьнятымі нязьмерна вышэй прымітыўных поглядаў рэлігійнікаў. Ня прыходзіцца гаварыць пра тое, што яны самі зьяўляюцца толькі адным з тыпаў рэлігійнікаў, якім трэба няўтомна ўспамінаць словы Ўладзімера Ільліча, што ўсякія ды ўсялякія імкненьні богашуканьня і богатворчасьці адрозьніваюцца адно ад аднаго ані кроплі ня больш, як жоўты чорт адрозьніваецца ад чорта сіняга. Нашы містыкі самі выкрываюць рэлігійную брыдоту, але яны забываюцца, што „мільён грахоў, паскудзтва, гвалтаў і фізычнай заразы куды лягчэй выкрываюцца масай і дзеля таго значна менш шкодныя, чым тонкая духоўная, апранутая ў самыя прывабныя „ідэйныя“ гарнітуры ідэя божачкі“...

## СУВЯЗЬ РЭЛІГІЙНАСЬЦІ З АБРАДАВАСЬЦЮ.

Абрадавасьць, як вядома, зьяўляецца адным з асноўных элемэнтаў, ствараючых рэлігію. Што выявіла ў гэтым кірунку наша дасьледваньне?

Дасьледваньне сьцьвердзіла, што ў пераважнай большасьці веручых рэлігійнасьць выліваецца ў абрадавую форму. Гэта правільна ў адносінах да 88,5% усіх выяўленых анкетай веручых. Толькі 11,5% веручых ня выконваюць абрадаў, прычым толькі самая нязначная частка з іх менш 1% усіх веручых ня выконвае сьвядома, думаючы прытрымлівацца па-заабрадавай рэлігіі, іншыя ж па неабходнасьці, з прычыны розных незалежных абставін.

Анкета выявіла, што цырымонійна-абрадавы элемэнт рэлігіі мае для пэўнай часткі веручых вялікую прывабную сілу. Якраз абрад дае ім магчымасьць урачыста адзначыць значную падзею ў жыцьці, дае выхад для эмоцыянальных настрояў упрыгажае жыцьцё, дае эстэтычную асалоду. У гэтым сіла абраду, як спосабу рэлігійнага паланеньня душ. „Мы бачым у рэлігійным абрадзе свайго роду забаву, бо лепшага і больш прывабнага нам нічога не паказваюць“, піша група саматужнікаў і рамесьнікаў з мястэчка Крычава.

У гэтых ці іншых формулёўках такая думка праходзіць у радзе анкет. „Ці ёсьць бог—ня ведаю, але абрады яўрэйскай веры вельмі люблю выконваць“, піша кравец 26 г. з м. Гарадца. „Я выконваю ўсе абрады, малюся, пашчуся. Абрады выконваю з прыемнасьцю, бо мне падабаецца іх урачыстасьць“, чытаем мы ў анкеце гандляра 63 г. з таго-ж самага мястэчка. 22 г. рабочы, трапіўшы ў Папраўчы Дом, беларус, вельмі рэлігійны, кажа, што „калі ўваходжу ў царкву, дык адчуваю сябе досыць вясёла“. „У касьцёл хадзіць прыемна. Лепш за тэатар. Адпачываеш там за цэлы тыдзень“, піша 37 г. хутаровец з Койданаўскага раёну. „Калі-б ня было нашых вялікіх сьвят, чалавек здурнеў - бы“, кажа селянін 28 г., беларус з Сьмілавіцкага раёну. „Зойдзеш у сабор, там пераэкываем хваляваньне душы, нават ня думаеш, ці ёсьць бог, але прыемна“, адказвае хатняя гаспадыня 32 г., жонка чырвонага камандзіра. Селянін 32 г. з в. Ігрушы ходзіць у царкву „як аматар царкоўных харавых сьпеваў“. Заслугоўвае ўвагі адказ 25 г. селяніна Нараўлянскага раёну з Мазыршчыны: „выконваю абрады для match разнастайнасьці жыцьця“.

Анкета яскрава паказвае, што абрадамі рэлігія бярэ ў палон ня мала душ. Гэта абазначае, што абрадаваму боку рэлігіі мы павінны проціставіць перш за ўсё мастацтва, якое можа даць масам сапраўдныя эстэтычныя эмоцыі, а ня іх сурогат, прысмакаваны містыкай і чартовінай. Гэта абазначае, што трэба даць масам тую „рознастайнасьць жыцьця“, якую яны шукаюць у рэлігіі і такім чынам трапляюць у яе палон. Гэту рознастайнасьць даюць і мастацтва, і спорт, і літаратура, і безьліч іншых культасьветных мерапрыемстваў. Гэта ўсё трэба мобілізаваць і дзякуючы гэтаму рэлігія страціць адзін з найбольш моцных вагароў узьдзеяньня на масы.

Мы ўжо казалі, што некаторыя веручыя абрадаў ня выконваюць. Гэта тыя з іх, што мараць веру сваю выліць у містычна-моральныя формы, пазбаўленыя відочнай абрадавасьці. „Рэлігія ў мяне самога і бог у мяне самога, а таму ў якіх-небудзь дзеяньнях для выяўленьня сваіх настрояў ня

маю патрэбы“, піша 30 г. настаўнік з Полаччыны. Некаторыя веручыя ня выконваюць рэлігійных абрадаў, каб ня выклікаць кпін прысутных. „Веру, але абрадаў ня выконваю, каб не насьміхаліся“, піша савецкі служачы яўрэй 47 г. з Віцебску.

Цікава адзначыць, што калі абрадавасьць трымае пэўную частку апытаных пад уладай рэлігіі, дык здараюцца выпадкі і іншага парадку: калі патрэба выкананьня абрадаў адхіляе ад рэлігіі. Вось характэрны з гэтага боку адказ рабочага Добрускай фабрыкі: „калі надыходзіў вялікдзень, дык пачынаўся пост і нельга было есьці скаромніны—мяса, сала, малака і г. д. Я бязумоўна пакутваў з голаду—усё ёсьць, але есьці нельга. Ну вось, я і пракляў бога і бажанят“.

Калі мы вышэй гаварылі пра выпадкі *невыкананьня* абрадаў *веручымі*, дык куды часьцей мы сустракаем зьявы адваротнага характару, г. зн. *выкананьне* абрадаў *няверучымі*. Мы ўжо казалі, што гэта зьява заўважацца сярод 2% няверучых і такім чынам варта таго, каб да яе прыглядзецца больш уважліва.

Выкананьне абрадаў няверучымі абумаўляецца або сілай звычкі і шматгадовай традыцыі, або нежаданьнем стаць у конфлікт з акружаючымі.

Мы ў належным месцы падрабязна спыняемся на консэрвуючай сіле гэтых двох фактараў—тут толькі адзначым, што абрадавасьць—тая галіна, у якой гэта сіла выяўляецца асабліва адчувальна.

Работніца панчошнай фабрыкі ў Віцебску, 30 г., кажа: „У бога ня веру, але мацу на пасху пяку, бо ў нас у сям‘і заўсёды пяклі“. „Ад рэлігіі адышоў з таго часу, як паразумнеў, але ў царкву ў сьвяты хаджу, як і 30 год хадзіў, бо звычка міжвольна штурхае“ (селянін 37 г. Пятрыкоўскага раёну). „Паразумненьне“, як бачым, ня зусім вялікае...

А вось і ўзоры „ўлады асяродзьдзя“: „Ні ў якага бога ня веру, не зьяўляюся прыхільнікам якой-небудзь рэлігіі, але дзяцей хрышчу ў праваслаўным абрадзе, каб не па-

крыўдзіць жонку" (беларус, сёлянін 32 г. з в. Сініка, Сьмілавіцкага р.). „У бога ня веру. Абрады выконваю, каб людзі дрэнна не гаварылі" (яўрэйка, гандлярка 32 г. з м. Гарадца, Рагач. р.). „З верай уперад ня іду, але і ззаду не адстаю. Як людзі, так і я" (селянін 48 г. з Ветрынскага р.). „Ня веру, але ў хаце ў мяне абразы, бо баюся людзей. І так бедна, а калі веручыя апаганяць—будзе зусім кепска жыць" (сялянка-бяднячка 25 г., з в. Млына, Слуцк. р.). Вось яна ўлада кулацкай грамадзкасьці, якая на 14 годзе рэволюцыі яшчэ тэрорызуе бяднячку-бязбожніцу пагрозай „апаганіць" яе за разрыў з рэлігіяй.

А вось і зьява новага парадку — спроба сьвятошна схаваць пакорлівасьць паганскай абрадавасьці апэляцыяй да высокіх мотываў гігіены: „зусім няверучы, але сыну зрабіў абразаньне, бо навукова даведзена, што гэтага вымагае гігіена", піша зубны доктар, 34 г. з Гомелю.

У нашым дасьледваньні абрадавасьць выпуклілася як адзін з найважнейшых сродкаў, што ёсьць у рэлігіі, і гэту акалічнасьць нам канечна трэба мець на ўвазе ў практыцы ўсяе нашае антырэлігійнае работы.

## АРГУМЭНТАЦЫЯ РЭЛІГІЙНІКАЎ.

Анкеты вялікай колькасьці веручых перапоўнены довадамі існаваньня бога і конечнай патрэбы існаваньня рэлігіі.

Для довадаў за існаваньне бога тыповы адказы такога парадку: „Калі мы бачым рэчы, ня створаныя рукамі чалавека, як напр., сонца, зоркі, дык значыць існуе творца, які стварыў іх. Хто-ж гэты творца, калі ня бог?"... (адказ 50 г. селяніна-беларуса з Папраўчага Дому). „Калі існуе сьвет, значыць існуе і яго гаспадар, якога трэба слухацца" (стальмах-яўрэй 67 г. з Рагачэву). Пераважная большасьць анкет, у якіх ёсьць довады існаваньня бога, знаходзіцца на роўні гэткай самай дзікунскі беднай аргумэнтацыі... „Як-бы ні мудрагелілі вучоныя, яны ніколі ня здолеюць растлума-

чыць таго, якім чынам зьявілася ўсё, што мы наглядаем на сьвеце. Яны высьвятляюць толькі зьмены прыроды, але не яе стварэньне. Гэтага нельга зразумець, калі не паверыць у творца ўсяго—бога (сьлесар-саматужнік, 46 г., Віцебск).

Довады канечнай патрэбы існаваньня рэлігіі грунтуюцца на меркаваньнях грамадзкага парадку. 42 г. селянін з Сьмілавіцкага раёну піша: „Ёсьць бог ці няма — ня ведаю, але думаю, што ў грамадзтве патрэбна дысцыпліна ці страх. Бяз рэлігіі гэта немагчыма“. Сялянка 50 г. з в. Валосавічы знаходзіць, што „калі дзяржава ня можа існаваць без кіраўніка, дык зразумела і ўся зямля мае свайго кіраўніка. А дзеля таго трэба верыць у бога“. „Усё чалавецтва,“ — філёзофнічае 40 г. савецкі служачы з Барысава — „адчувае патрэбу мець над сабою пэўную ўладу, якая кіравала-б яго ўчынкамі і паводзінамі“. „Трэба верыць у бога, бо калі ня будзем верыць у яго існаваньне“, — паглыбляе думку барысаўскага савецкага служачага 50-гадовы селянін з в. Каніч,— „тады мы перарэжам адзін аднаго“. Так разважаюць тыя, каму рэлігія патрэбна, як моральная вуздэчка, як паліцэйскі рэгулятар паводзін чалавека.

Некаторыя анкеты маюць туманныя „філёзофічныя“ разважаньні аб тым, што людзям патрэбны „адміністрацыйныя“ і „внушительные“ органы кіраўніцтва, дзяржава зьяўляецца адміністрацыйным органам, рэлігія — „внушительным“, без таго і таго чалавецтва ня можа існаваць,—аб тым, што „калі чалавецтва страціць веру ў бога, дык зьнікне розьніца між чалавекам і жывёлай“, аб тым, што „рэлігія зьяўляецца адзінай і непаўторнай вартасьцю, якую мае чалавецтва“ і г. д.

Довады рэлігійнікаў сваёй прымітыўнасьцю, сваім небагатым трафарэтам яшчэ раз сьведчаць, што дасьледваныя нашай анкетай веручыя знаходзяцца на вельмі нізкім культурным роўні і думка іх круціцца ў вельмі цесным коле ўяўленьняў, абмежаваным рэлігійнай догматыкай.

# СЯМ'Я І ЎПЛЫЎ ЯЕ НА РЭЛІГІЙНАСЬЦЬ.

Асяродзьдзе, у якім выраcталі і выхоўваліся апытаныя, рабіла рашаючы ўплыў на іх адносіны да рэлігіі. Спасыланьні на гэта мы маем у 15% анкет. Але і там, дзе няма непасрэдніх зазначэньняў на гэта, ёсьць весткі аб тым, які ўплыў сямейнага і наогул бліжэйшага абкружэньня формаваў рэлігійны ці атэістычны сьветапогляд дзіцяці, іншы раз пачынаючы з самага маленства, і тым самым азначаў яго на дзесяткі год, часта на ўсё жыцьцё. Тая рэлігійная прышчэпка, якую рабіла дзіцяці бабка ці дзед, бацькі ці мамка, іншы раз зьяўлялася такой дзейнай, што калі дарослы чалавек сьвядома розумам разрываў з верай, дык ён часамі яшчэ і далей выконваў абрады, да якіх прызвычаіўся яшчэ ў маленстве.

Нашы анкеты ў пераважнай большасьці кажуць аб тым, як рэлігійная сям'я дзеяла на псыхіку дзіцяці, як яна ўбівала ў яе патрэбу богашанаваньня і выкананьня абрадаў, як тэрорызавала яна гэту псыхіку ўсялякімі страхоцьцямі і пагрозамі будучай кары за парушэньне рэлігійных прынцыпаў, і, наадварот, як абяцала ёй узнагароду за пакорлівасьць гэтым прынцыпам. Сотні анкет кажуць аб тым, што „маці і рэбэ апавяданьнямі, байкамі, жыцьцём сьвятых накіроўвалі маю думку да бога. Яны пераконвалі мяне, што ёсьць адзін бог і ён уладае ўсім сьветам. Яны прымусілі мяне паверыць, што гэты бог сочыць за ўчынкамі кожнага і бяда будзе таму, хто сваімі ўчынкамі парушае волю бога“ (рабочы яўрэй 28 г., Менск). Сотні анкет кажуць аб тым, што „бацькі былі вельмі веручымі. Яны прышчаплялі мне веру ў богу застрашваньнем, г. зн. калі буду верыць, пасьля сьмерці траплю ў рай, а калі не, буду ў пекле гарэць у вечным агні і г. д.“ (дзяўчына 17 г., скончыўшая сямігодку). А дзеля таго часта патрэбны вельмі моцныя штуршкі, каб страцілася вера, увагнаная ў думку чалавека тады, калі ён быў у самым успрыймальным — дзіцячым веку. І часьцей

за ўсё ў гэтым веку сям'я прышчапляла апытаным рэлігійнасьць.

Па групе „а“ аб уплыве сям'і ў бок рэлігіі кажуць 93,1% адказаў, па групе „б“—67,6%, па групе „в“—100%.

Але намі зарэгістраваны рад выпадкаў, калі ўплыў сям'і накіраўваўся і ў бок вызваленьня ад рэлігіі дарослых яе членаў і атэістычнага ўмацаваньня дзяцей, якіх яна выхоўвала. Іншы раз зьяўленьне ў сям'і аднаго-двох бязбожнікаў прыводзіць да адыходу ад рэлігіі ўсяе сям'і. Селянін 22 г. з в. Бабы кажа, што ён да 14 год быў зусім рэлігійным. „У гэты час прыехалі мае браты з Амэрыкі. Пад іх уплывам я зразумеў, што багоў няма. Яны мяне пераканалі, што рэлігія—гэта дурман. Я зразумеў, што гэта сапраўды так“... Вельмі часта выпадкі адыходу ад веры жанчын пад уплывам мужоў. „У 1925 г. муж уступіў у комуністычную партыю і тады я канчаткова кінула верыць“ (колгасьніца 36 г.). „Вышла замуж за няверучага і пашла сьледам за ім. Цяпер у багоў ня веру ні ў нашых, ні ў вашых, і калі будавалі дом, я не дазволіла ставіць крыжы і пасьвянцаць яго, хоць некаторыя суседзі і крычаць“ (сялянка 46 г. з. в. Маковіца). „Пералом ад веры ў бога да бязбожжа адбыўся, калі вышла замуж за рабочага ў 1922 г. Муж ня верыў у бога і мне растлумачыў, што багоў няма“ (хатняя гаспадыня 22 г., Асіповічы). Але не заўсёды жонкі так бязбольна капітулююць перад бязбожжам мужоў і часта на гэтым грунце здараюцца вострыя конфлікты. Селянін 27 г. в. Садонскай піша: „Цяпер ідзе пералом з жонкаю і часта бываюць сваркі“...

Цікавым фактам зьяўляецца ўплыў дзяцей на бацькоў. Аб гэтым своеасаблівым факце антырэлігійнага выхаваньня дзецьмі бацькоў апавядае рад анкет. Селянін 58 г. з в. Сінікін кажа: „Пералом быў ва ўзросьце 48 г. ад веры ў бога да бязбожжа. Ён быў выкліканы тлумачэньнямі дзяцей, якія цяпер ходзяць у школу, яны ў хаце чытаюць розныя кнігі і пераканалі мяне, што няма ніякага бога, ні чорта.“ Другая

сялянка 47 г. кажа: „У мяне быў пералом у 1924 г. з таго часу, як сын зрабіўся комсамольцам. Ён мне ўсё растлумачыў, потым я сама пераканалася на фактах, што гэта няпраўда, быццам бог ёсьць“. Змаганьне бацькоў і дзяцей на рэлігійным грунце часта выклікаюць капітуляцыю першых, як пра гэта маляўніча кажа 56-гадовы селянін з Чырвонай Слабады: „У маіх рэлігійных зьменах адыгралі вялікую ролю дзеці, з якіх адзін—настаўнік, два—комсамольцы, адзін—піонэр. Спачатку я вёў барацьбу з дзяцьмі, але адзін у полі не ваяка і паступова давялося паддаца іх уплыву“.

Так моладзь выступае ў ролі завадыяша бязбожжа, і тое адвечнае асяродзьдзе, чыя мярцьвяцкая традыцыя аддавала ў палон рэлігіі тысячы дзіцячых душ, само пачынае падаць пад націскам бязбожнай, антырэлігійнай моладзі.

## УПЛЫЎ ШКОЛЫ І НАВУКІ.

Дасьледваньне яскрава выявіла ўплыў школы на рэлігійнасьць. Магутная выхаваўчая роля школы натуральна выяўляецца ў фармаваньні і рэлігійнага і антырэлігійнага сьветапогляду. Школа ня можа заставацца нэўтральнай у такім цэнтральным пытаньні сьветапогляду, як рэлігія. Яна або паднявольвае дзіця рэлігійнай ідэолёгіі, сыстэматычна прышчапляе яму рэлігійную інфэкцыю, укараняе ў яго псыхіку элемэнты богашанаваньня, сее ў яго душы зерняты містыкі і тагосьветнасьці, або, наадварот, выхоўвае яго сьвядомым матар'ялістым, які ўмее разумна глядзець на навакольныя падзеі і навукова разумець сусьветны процэс, выхоўвае супраціўнікам усялякага паганства і містычнай чартовіны. Але так ці інакш уплыў школы на дзіця не застаецца бяз выніку. Наша анкета дае лішні довад гэтага.

45% дасьледваных намі па асноўнай групе „а“ кажуць пра школу, як пра самы важны фактар, уплываўшы на іх адносіны да рэлігіі. У які бок накіроўвала школа сьветапогляд сваіх выхаванцаў—у рэлігійны ці атэістычны? Пера-

важная большасьць тых адказаў, якія мы маем, кажуць аб тэолёгізуючым уплыве школы і толькі меншасьць—аб яе атэістычным уплыве. Так, па групе „а“ 53,6% адказаў кажуць аб тым, што школа ўплывала ў бок умацаваньня рэлігіі і 46,4%, што гэты ўплыў быў у бок вызваленьня ад улады рэлігіі. Па групе „б“ аб школе, як рэлігійным фактары, кажуць 84,1% адказаў, па групе „в“—76,3%, па групе „д“—71,5%.

Адказы аб тэолёгізуючым уплыве школы даюцца выключна асобамі ў веку звыш 25 год, г. зн. выключна выхаванцамі дарэволюцыйнай школы. Выпадкаў такога ўплыву з боку савецкай школы намі, натуральна, не зарэгістравана ніводнага. Але ў той-жа самы час ёсьць досыць значная колькасьць анкет, якія сьцьвярджаюць, што савецкая школа, дзе яны выхоўваліся, не зрабіла ўплыву на іх рэлігійныя настроі,—анкет, з якіх можна бачыць, што ў дзяцей, што прыходзілі ў школу з рэлігійнага асяродзьдзя, савецкая школа не магла зьнішчыць мікробаў рэлігійнасьці. Хоць большасьць такіх анкет мае на ўвазе савецкую школу першых рэволюцыйных гадоў, але ўсё-ткі гэта досыць сур‘ёзны напамінак аб тым, што справа антырэлігійнага школьнага выхаваньня ня можа лічыцца ў нас добра пастаўленай.

Кажучы пра ўплыў, які мела старая школа ў кірунку рэлігійнага выхаваньня, трэба падкрэсьліць, што гэты ўплыў часта замацоўваў рэлігійную рашчыну, якую дзеці ўжо атрымалі ад сям‘і і бліжэйшага асяродзьдзя. Закон божы, катахізм ды іншыя спосабы рэлігійнага ўзьдзеяньня на маладыя душы канчалі гэту справу. Праўда, гэта ўдавалася ім не заўсёды. Здараліся выпадкі, што ўсё гэта давала зусім адваротныя вынікі: „Школа (гімназія) вымагала строгай рэлігійнасьці“,—піша навуковы працаўнік 45 год з Віцебску,—„як протэст супроць рэпрэсій спачатку стадыя кпін і анэкдотаў, потым пашырэньне кругагляду шляхам знаёмства з сыстэмамі матар‘ялістычнага сьветапогляду“. Пра тое самае, прыкладам, піша і другі навуковы працаўнік 46 г., немец па на-

цыянальнасьці. „У школе ня было ўплыву, які замацаваў-бы маю дзіцячую веру. Наадварот, абавязковая і афіцыяльная рэлігійнасьць у школе штурхала мяне ад веры.“

Разам з тым у старой школе вельмі часта ўзьнікалі супярэчнасьці між афіцыяльнай рэлігійнасьцю, якая пропагандавалася школай, і навукай, якую ў школе выкладалі. Гэтыя супярэчнасьці рабіліся важным фактарам бязбожжа. „У школе навука пачала абвяргаць тое, што кажа рэлігія. Поп растлумачыў, нібы Мёртвае мора стварылася ад таго, што бог спаліў тры гарады грэшных людзей, але ў той-жа дзень прышоў настаўнік географіі і сказаў, што Мёртвае мора стварылася дзякуючы вульканічным сілам і мёртвае яно з тае прычыны, што мае атрутную соль, якая губіць жывыя стварэньні. Я зразумеў, што рэлігія маніць“ (фэльчар-беларус 34 г., Чэрвенскі раён). „Калі я вучыўся ў народнай школе, дык настаўнік тлумачыў нам, што чалавек паходзіць ад малпы, тым часам як поп на другой лекцыі казаў, што бог стварыў першага чалавека. Гэта прымусіла задумацца над пытаньнем аб рэлігіі“ (хатняя гаспадыня 24 г. з в. Кармачы). Паданыя адказы тыповы для цэлага раду выпадкаў, пры якіх у школе стыкаліся навука і рэлігія, і ў выніку—дзіцё траціла рэлігійную веру, хоць увесь школьны апарат і быў накіраваны, каб захаваць і культываваць яе. Адзін зьняволены 36 г., румын па нацыянальнасьці, з вышэйшай адукацыяй, кажа: „з 12-13 год я кінуў паважаць настаўніка закона божага і бываючы сярод вучняў старэйшых кляс, да ўсяго прыслухоўваўся і рабіў вывады, што між законам старога і новага заветаў ёсьць разрыў, выкліканы выдумкамі аб цудах, я зразумеў, што няма багоў і сьвятых“.

Што да ўплыву ў памянёным кірунку савецкай школы, дык, як мы ўжо казалі ў радзе выпадкаў гэты ўплыў быў слабы і ня меў вынікаў. Але, побач з гэтым ёсьць шмат фактаў моцнага вызваленчага ўплыву савецкай школы, „распрыгоненьня“ ёю дзіцячых галоў ад тых рэлігійных

забабонаў, якія ўбіваліся ў іх несьвядомай сям'ёй і асяродзьдзем.

16-гадовы падлетак-яўрэй, селянін в. Чырвоная Слабада, выхаваны ў строга рэлігійным духу, прывучаны выконваць рэлігійныя абрады, кажа: „У мяне быў пералом ад веры ў бога да бязбожжа ва ўзросьце 10 год. Гэты пералом быў выкліканы тым, што я зрабіўся больш сьвядомым, пабыўшы ў школе. Школа дала мне веды і я кінуў верыць у такое глупства, як рэлігія“. Другі падлетак такога-ж узросту, беларус з в. Дзяхцянай Капыльскага раёну, атрымаўшы ў сям'і рэлігійна-фанатычнае выхаваньне, таксама ад школы меў штурхач да разрыву з рэлігіяй: „калі я пачаў вучыцца ў савецкай школе, для меня зрабіліся відавочнымі адмоўныя рысы рэлігіі. Я адмовіўся ад рэлігіі і ўсіх забабонаў і цяпер змагаюся з імі“. Селянін 17 г. з в. Смалічы Чырвона-Слабодзкага раёну кажа, што да паступленьня ў школу ён верыў так, як гаварылі яму дзяды і бацькі, а пасьля „ў школе мне пачалі тлумачыць, што ўсё гэта няпраўда,—ніякага бога няма і высьветлілі, з чаго бывае пярун, з чаго вясёлка і г. д. Я і кінуў верыць“. Яшчэ адзін адказ гэткага роду: „Пералом да бязбожжа быў выкліканы вучэньнем у савецкай школе і тлумачэньнямі настаўніка. Я з таго часу ўступіў у ячэйку бязбожнікаў і сьвядома вяду барацьбу супроць усялякіх рэлігійных забабонаў“.

Паданыя адказы сьцьвярджаюць, што пры належнай пастаноўцы справы антырэлігійнага выхаваньня наша школа можа стацца моцным фактарам зьбіраньня ў краіне арміі маладых і пераконаных бязбожнікаў.

Само сабой зразумела, што вызваленчы ўплыў навукі для шмат якіх веручых, выяўляўся ня толькі праз школу, але і праз іншыя фактары. Літаратура, прыродазнаўчая асьвета, асьвета ў шырокім сэнсе слова рабілі, бязумоўна, сваю справу. Лепшым паказальнікам таго, што навука і рэлігія ня могуць жыць між сабой лагодна, зьяўляецца той факт, што з дасьледванай намі групы навуковых пра-

цаўнікоў, г. зн. людзей, вытворчасьцю якіх ёсьць навука, 68,2% паведамляюць, што ад рэлігіі іх адцягнула ня што іншае, як толькі навука.

Агроном 36 г. з Самахвалавіч кажа, што ён шчыра верыў, покуль не пачаў займацца прыродазнаўствам. „Бяз прыродазнаўчых навук ня мог адмовіцца ад рэлігійнага наркозу. Адначасна з уразуменьнем прыродазнаўчых навук адбываўся і мой пералом да бязбожжа... З практыкі сваёй уразумеў, што барацьбу з рэлігіяй можна весьці толькі праз прыродазнаўчыя навукі“. „Чым больш чытаў навуковых кніжок,“—піша селянін 44 г., скончыўшы пачатковую школу, з в. Балочыц,—„тым менш застаецца веры“. Другі селянін 34 г. да 10 год „верыў з запалам. Шмат чытаў кніжок навуковага характару аб пахаджэньні зямлі і чалавека і шмат іншых. Потым я пачаў раўнаць царкоўныя кнігі, г. зн. біблію з навуковымі. І шмат знайшоў маны ў царкоўных кнігах. Пачаў хістацца і ўрэшце кінуў назаўсёды бога і папоў з іх сволаччу“. Прыклад таго, як развальваецца рэлігійны будынак пад націскам прыродазнаўства, падае 25 г. селянін з в. Сабалі: „Пералом быў выкліканы ў мяне зацьменьнем месяца, пра якое поп на другі дзень пасьля гэтай зьявы доўга гаварыў у царкве, а потым калі я вычытаў ў кніжках, з чаго гэта бывае, дык кінуў верыць папу, а пасьля зразумеў, што ніякага бога няма“.

Цікава яшчэ адзначыць, што шмат веручых, асабліва тыя, хто хістаецца, у сваіх анкетах ставяць пытаньне аб тым, што некаторыя вучоныя ўсё яшчэ веруць. Гэта, на іх думку, зьяўляецца довадам таго, што навука зусім не абвяргае веру, але сумяшчальная з ёю. На гэтай зьяве мы спынием сваю ўвагу, калі гаворым аб рэлігійных настроях сярод навуковых працаўнікоў.

## МАНА І ХЦІВАСЬЦЬ ДУХАВЕНСТВА, ЯК ФАКТАР АДЫХОДУ АД РЭЛІГІІ.

Высьвятленьне з практыкі жыцьця эксплёататарскай ролі рэлігіі ды маны, якая культывуецца духавенствам, яго лёкайства перад прыгнятальнікамі—адыгрываюць ролю аднаго з самых важных фактараў дэтэолёгізацыі насельніцтва і адыходу мас ад рэлігіі. Спасыланьні на гэты фактар сустракаюцца ў 9,7% усіх анкет асоб, перажыўшых пералом ад веры да бязбожжа.

Батрак 37 г. з в. Снадзін Петрыкаўскага раёну піша: „Пералом да бязбожжа быў выкліканы тым, што папы нас увесь час палохалі пеклам, а самі апошні кавалак у нас адбіралі. Калі я зразумеў гэта, дык сказаў: „прэч рэлігію, няхай жыве бязбожжа... Прэч папоў і кулакоў. Будзем верыць у культурную асьвету“. Служачы паштова-тэлеграфнай канторы ў Гомлі кажа: „Пералом у мяне быў, калі я пераканаўся, што рэлігію скарыстоўваюць для матар'яльных мэт, хаваючыся за імя бога; яе служкі проста шэльмы, хлусяць другім і самі ня вераць і агітуючы шукаць „лепшае“ на небе, самі дамагаюцца „лепшага“ на зямлі. Я адмовіўся ад бога і ад яго служак“.

Селянін-бязбожнік 73 г. з Ветрынскага раёну (Полаччына) паведамляе, што пералом у яго быў пасьля таго, як ён яшчэ падлеткам стаў „на запашку“ да папа. Жывучы побач з папом, ён пабачыў, што „поп сам ніколі ня выконваў нічога з таго, што вымагаў ад сялян, і з таго часу я страціў рэлігію і больш да яе не вяртаюся“...

У большасьці выпадкаў у разуменьні эксплёататарскай ролі рэлігіі ды хлусьні яе прадстаўнікоў адбывалася ў дасьледваных асоб пад уплывам якога-небудзь вельмі конкрэтнага выпадку ці падзеі.

Селянін з Самахвалавіцкага раёну, 36 г., кажа: „Пералом быў выкліканы з боку духавенства на 24 г. Мне давялося быць на споведзі. Калі я даў папу пяць капеек, ён мяне ня

ўзяў на споведзь“. У савецкага служачага 45 г. з Віцебску, селяніна па пахаджэньні, супроцьрэлігійны пералом адбыўся ў юнацкім веку. „Ён быў выкліканы злачынствамі папоў, якія яны рабілі сялянам нашай вёскі, бо зямля, дзе знаходзілася вёска, была царкоўнай. Мы за яе плацілі папу вялікія грошы і выконвалі розную работу натурай. Поп уладаў ня толькі нашай гаспадаркай, але і нашымі думкамі“. Селянін-беларус 58 г. апавядае, што ў яго разрыў з рэлігіяй быў з прычыны службы ў старой арміі: „Вайсковае начальства заўсёды прымушала хадзіць у царкву маліцца, а поп заўсёды вымагаў „шанаваць“ начальства, што было мне брыдка і выклікала адыход ад веры“. Другі селянін 28 г. так характарызуе прадпасылкі свайго пералому. „Калі я вучыўся, дык хадзіў пяяць на крыласе і добра азнаёміўся з папоўскім жыцьцём... я бачыў, што яны нас прымушалі верыць, робячы ўсё толькі на словах... Аднойчы поп мяне паспавядаў і загадаў пасьціцца, я потым пашоў да яго дамоў і там усё было інакш“.

Цікавае паведамленьне аднаго студэнта-паляка. Выхаваны ў строгай рэлігійнасьці, ён трапіў пад уплыў аднаго ксяндза, які ўцягнуў яго ў „Саюз польскіх рабочых“. „Ксёндз жыў ва ўсіх адносінах шырэй і лепш за людзей, бывшых, у адной з ім арганізацыі. Ён жыў, як з жонкай, з адной татарскай купчыхай, тым часам, як ня меў права рабіць гэтага. Ён сам ніколі не пасьціў, але вымагаў гэтага ў сваіх казаньнях. Калі я пайшоў у тэатар, а на другі дзень у касьцёл і пабачыў, як ксёндз моліцца, дык у мяне зьнік увесь яго аўтарытэт, а разам з гэтым і вера“.

Вельмі маляўніча аб прычынах свайго адыходу ад рэлігіі апавядае беларус-саматужнік 29 г. з в. Маніўчыцы Койданаўскага раёну: „Я вучыўся ў г. Курску. Калі поп прышоў у клясу, я залёг на заднюю лаву. Ляжу і гляджу. Ён увайшоў, дастаў бутэльку з гарэлкай. Зірне і глытне. Яшчэ зірне і зноў глытне. Аднаго разу, калі ён мяне паклікаў і загадаў сказаць малітву, я і сказаў: „А вы сёньня яшчэ ня пілі

гарэлкі“. Поп раззлаваўся, адабраў шапку ад мяне і пагнаў дамоў. Бацька павёў мяне за шапкай і пабіў мяне. Так я і кінуў верыць папом і богу“.

35 гадовы селянін з колгасу Жгунь на пытаньне аб тым, ці быў у яго жыцьці пералом да бязбожжа, адказвае: „Быў: калі поп і дзяк пасварыліся за сабраныя грошы ў царкве, адзін частку стаіў, а другі пакрыўдзіўся за гэта і пачалі яны пры мне і панамарысе адзін аднаго лаяць, а грошы ўсе былі на сьвятыя мэты. Ну, а ў арміі я пераканаўся, што бога зусім няма, бо як нас гналі ў бойку, дык з богам ідзем, а саміх папоў у баёх ня было, і нас бог не ратаваў, а забівалі як сабак; тут я прызнаў, што бога і няма і ня было— 15 год таму назад“.

Навуковы працаўнік 33 г., выгадаваны ў такой мясцовасьці, дзе быў манастыр, апавядае: „Калі быў у кляштары дык бачыў, як манахі гарэлку пілі, да сябе ў кельлі баб вадзілі, цішком сьвініну елі, а другім забаранялі. Яны палохалі, што калі перайсьці супроць прастолу ля царскіх варот, дык адразу памрэш. Але я паспрабаваў арганізаваць там чахарду з малых хлопцаў і сам скакаў і нічога з намі ня было. Тады—у 12 год—і быў у мяне пералом да бязбожжа“. Гэта не адзіны выпадак, калі манастыр штурхаў да бязбожжа. Настаўнік з Віцебску таксама паведамляе, што бацька яго батраком быў у жаночым манастыры. „Апавяданьні яго аб жыцьці манашак і наогул аб жыцьці ў манастыры зрабілі мяне зусім няверучым“. Разносчык 34 г. з Мозыру піша: „Матка служыла ў жаночым манастыры ў Кастрамской губ. Аднаго разу яна паехала, і я там адзін застаўся. Мне было гадоў 12. Мяне адна старая манашка паклікала ў кельлю. Частавала гарбатай. А потым такое пачала са мной рабіць, што і гаварыць каму-небудзь сорам. Калі я пайшоў, дала мне 30 кап. на цукеркі і забараніла каму-небудзь гаварыць аб тым, што было, інакш мяне адсюль прагоняць... Тады я зразумеў, якія сьвятыя тут жывуць і кінуў ім верыць“.

Некаторыя з апытаных адышлі ад веры дзякуючы ўскрытым машчам і выяўленаму ашуканству духавенства. Усё гэта зрабіла на іх моцнае ўражаньне.

Селянін беларус 43 г. з в. Верхаменьне з Полаччыны паведамляе, што яго пералом да бязбожжа быў абумоўлены прысутнасьцю пры ўскрыцьці машчэй „сьвятой“ Афрасіньні ў Полацку, пераканаўшым яго ў нахабным ашуканстве з боку духавенства. „Вера адразу зьнікла“. Другі селянін з в. Чорнае апавядае, што паломніцтва ў Кіеўскую Ляўру і нагляданьні над машчамі пераканалі яго, што „гэта ня целы нятрухлелыя, але чурбакі“. Пад уплывам гэтага вера захісталася, гутаркі з няверучымі закончылі пачаты пералом. З учынкаў папоў, падарваўшых у апытаных веру, успамінаюцца яшчэ іхныя ўчынкі ў часе барацьбы Ціханаўскай і жывой царквы. Так, сялянка 22 г. з. в. Ігрушка Крупскага раёну піша: „Повадам да пераломy было тое, што сельскі поп пры пераходзе на новы каляндар пачаў служыць па-новаму, а сам працаваў у гаспадарцы па-старому. Калі сяляне кінулі хадзіць у царкву па новаму, ён зноў дзеля мэт нажывы пачаў служыць па-старому. Што-ж гэта такое?“

У шмат якіх асоб, перайшоўшых ад веры да бязбожжа, гэта было вынікам доўгачаснага зруху ў сьветапоглядзе і пераацэнкі. У такіх выпадках антырэлігійны пералом абумаўляецца процэсам паступовага знаёмства з літаратурай, навукай, уплывам агітацыі і пропаганды, азнаямленьнем з гісторыяй рэлігіі ды яе грамадзкай роляй, палітычнай асьветай і г. д. У групы асоб, якую мы цяпер характарызуем, пералом праходзіў інакш—ён быў вынікам той ці іншай падзеі, адразу высьвятляўшай перад апытаным ролю рэлігіі, як дапаможніцы эксплёататараў і спосабу ашуканства мас профэсіяналамі рэлігіі. Асобны выпадак даваў штуршок, і раптоўна валіўся ўвесь будынак веры ў бога і паслушэнства папом. Магчыма, што будынак гэты захістаўся яшчэ раней, але асобны факт самавыкрыцьця рэлігіі прымусіў яго разваліцца.

Апавяданьне 56-гад. селяніна з Чырвонай Слабады вельмі тыпова з гэтага боку. „Пералом быў выкліканы падарожай у Журавічы Слонімскага павету, дзе пасьля начы высахла помпа і нельга было дастаць вады. Манах тлумачыў, што нейкі чалавек грэх зрабіў, а таму вада ня ідзе. Трэба чакаць імшы, пасьля яе вада пойдзе. Я ведаў, што такое помпа і як уліў чарпаком ваду ў яе, дык вада пачала пампавацца. За гэта мяне хацелі арыштаваць. Я ўцёк і кінуў верыць папом“.

Трэба адзначыць, што зьява аналёгічных раптоўных разрываў з верай паводле анкет тыповая для юнацкага ўзросту. Відаць, у гэтым веку рэакцыя на выяўленую несправядлівасьць і ашуканства бывае больш бурнай і больш непасрэднай. Але намі зарэгістраваны і выпадкі, калі людзі вельмі пажылыя жахліва адыходзілі перад раптоўна выкрытай перад імі рэлігійнай брыдотай і беглі ад таго, чаму верылі дзесяцігодзьдзі.

## СОЦЫЯЛЬНАЯ НЕСПРАВЯДЛІВАСЬЦЬ І АСАБІСТЫЯ НЯЎДАЧЫ.

Довады ад соцыяльнай несправядлівасьці, ад цяжкіх умоў жыцьця, асабістых няўдач сустракаюцца амаль у 4% анкет.

Найбольш характэрна для адказаў гэтага роду спасыланьне на тое, што вера зьнішчана фактам існаваньня жабрацтва побач з багацьцем, тым, што сотні тысяч гінуць ад нэндзы, тым, што ў грамадзкім жыцьці перамагае несправядлівасьць, адным словам, як сказаў у сваёй анкеце адзін вучань сямігодкі в. Дабрыгор з Віцебшчыны, тым, што „бог ня клясава праводзіць лінію“... Думка аб „несправядлівым богу“, аб богу, абаронцы эксплёататараў, расчараваньне ў ідэі бога ў шмат якіх людзей, што зрабіліся бязбожнікамі, узьнікалі пад уплывам якой-небудзь зьявы ці падзеі, зра-

біўшых на апытаных асабліва моцнае ўражаньне. „Рэлігію кінуў з прычыны таго, што людзі жывуць неаднолькава— адны багатыя, другія бедныя, адны жывуць добра, другія кепска. І ўсю гэту няроўнасьць стварае бог",—піша навуковы працаўнік беларус 40 год. „Харошы бог, што стварыў так сьвет", ні-бы ў pendant да гэтага кажа 15-гадовы вучань сямігодкі. А вось і больш конкрэтная мотывізацыя ад социяльнай несправядлівасьці: „Матка пераконвала",— піша студэнтка-яўрэйка 24 г.,—„што бог—гэта нешта добрае, справядлівае, але ў 1919-20 г. у часе голаду была сьведкай пакуты на гэтым грунце і казала, што калі бог ёсьць, дык ён не павінен дазваляць гэтыя зьявы". „Бог нічым не дапамог яўрэям, калі былі пагромы і іх забівалі, а цяпер калі людзі ўзяліся, дык добра зрабілася" (колгасьніца-яўрэйка 56 г., колгас „Новы сьвет" Брагінскага раёну). „Пералом да бязбожжа быў выкліканы"—піша навуковы працаўнік, беларус 28 г.—„няшчасьцем і выключна цяжкімі ўмовамі жыцьця, а побач з гэтым існаваньнем памешчыкаў і наогул эксплёататараў, што адразу кідалася ў вочы".

Мотыў ад цяжкага матар'яльнага становішча, якога не зьмяняў бог, але якое само зьмянялася ў выніку асабістай актыўнасьці, гэты мотыў з рознымі індывідуальнымі варыяцыямі сустракаецца ў радзе анкет. Панчошніца 26 год з Віцебску кажа: „Дрэннае матар'яльнае становішча, у якім я была з маленства не давала месца думкам аб рэлігіі. А таму заўсёды была бязбожніцай"... Селянін 27 г. з в. Бялчы піша: „Пералом да бязбожжа быў выкліканы тым, што пераканаўся—колькі ні вер, колькі ні маліся, а калі сам ня зробіш што трэба сваёй працай, дык ніхто табе з неба манны ня кіне". „Зразумеў, што дзе кладуць гной, там родзіць, а дзе моляцца, там не" (электраманцёр 32 г. з м. Турава).

Няшчасьце, якое сустракае шчыра веручага, часта прымушае яго перагледзець свае пераконаньні. Думка веручага

ня можа згадзіцца з тым, што сіла, якая на яго думку ёсьць само дабро і праўда, пасылае яму бесчалавечныя і несправядлівыя ўдары. Тады ён адварочваецца ад гэтай сілы. „Аднойчы, калі мне было 9 год“,—апавядае работніца Віцебскай панчошнай фабрыкі,—„я страціла бацькоў, я маліла бога, каб ён дапамог мне знайсьці іх, але гэтага ня здарылася, і з таго часу я адступілася ад бога“. „Пералом быў выкліканы сьмерцю маёй улюбёнай сястры, аб выратаваньні жыцьця яе я прасіў, асабліва ў багародзіцы“ (селянін 28 г. з Балочыц). „Хварэла жонка, я прасіў бога, маліўся яму, каб яна паздаравела. Поп з богам нічога не зрабілі, я і кінуў верыць“ (селянін 32 г., Маленін). „Маліўся, пасьціў, каб ня браў маткі ад шасьцярых дзяцей, але ён не паслухаў мяне, жонка памерла. Я канчаткова пераканаўся, што малітва нічаму не дапамагае. І цяпер я не хачу верыць“ (селянін 47 г. з в. Камень). „Я цяжка хварэў, бог не дапамог, а доктар выратаваў“ (паштавік 36 г., Барысаў). „У мяне памерла жонка, двое дзяцей. Застаўся з малым дзіцём. Цяжка было. Лаяў бога, а ён не адпомсьціў. Яшчэ раз аблаяў, ізноў бясьсьледна. Я кінуў яго баяцца. Пасгупова і верыць кінуў. І сына гадую няверучым“ (селянін 46 г. з в. Рудні). „Пералом быў у 20 г. У мяне памёрла дзіця „Я вельмі прасіла бога, каб ён застаўся жывы. І калі дзіця памёрла, бог для мяне больш не існаваў“ (хатняя гаспадыня беларуска, 34 г., Менск). 35-гадовая сялянка—былая рэлігійная фанатычка, а цяпер пераконаная бязбожніца, піша: „Я верыла і спадзявалася на бога, але бог не дае чалавеку добрага жыцьця і не папераджае няшчасьці. Я зразумела, што калі зробіш у жыцьці глупства, дык малітва не паправіць, я прызнала, што няма чаго спадзявацца на бога, трэба самому разважаць. 16 год мяне выдалі замуж за старога 58 год і бог дазволіў гэта“... Характэрна наступнае апавяданьне 47-гадовай жанчыны з в. Лагавішчы: „Была прыгожай. Аканом прымусіў мяне да супольнага жыцьця. Нарадзілася дзіцё. Дома не давалі жыць. Мучылася, але думала, што ад бога і цяр-

пела. Усё верыла, пакутвала за свой грэх. Сын ужо дарослы, таксама пакутваў. Ня мог падняць галавы, бо байструк. Пасьля рэволюцыі яму далі зямлю... Ён—роўны чалавек. І тое, аб чым я ўсё жыцьцё прасіла бога—зрабіць майго сына роўным чалавекам—зрабіў Ленін. І я пераканалася, што бог для багатых. А нам цёмным людзям у яго верыць нельга. Трэба працаваць і самім дамагацца лепшай долі". 28-гадовая жанчына-немка, з сярэдняй адукацыяй, у раньнім ўзросьце вельмі рэлігійная, простытутка, піша: „З таго часу, як пачала займацца простытуцыяй, зусім кінула верыць. Я апынулася ў нейкім віру п'янства, оргій і вясёлага жыцьця і сустрэч з мужчынамі, для якіх ты—саміца. Але я ніколі ня думаю пра бога, бо прыходзіцца спадзявацца толькі на сваё цела і на сваю хітрасьць. Рэлігія не дапаможа маёй профэсіі... Я і мае таварышкі чакаем зьмен свайго лёсу ад іншага экономічнага стану, але ніякім чынам не ад рэлігіі".

Наіўна і непасрэдна адбываецца пералом да бязбожжа ў дзіцячым узросьце, калі атулены арэолем дабра, найвышэйшай праўды і ўсемагутнасьці гасподзь-бог зьяўляецца глухім і безадказным на самыя гарачыя малітвы, модлы і надзеі, якія ўскладае на яго дзіцячая фантазія. „Калі мне было 12 год і мая маці памерла, я ўсю ноч прастоіла на каленках перад абразом і маліла Хрыста выратаваць яе. А перад досьвіткам маці памерла. Я сказала сабе, што гэта ня бог, а зьвер. Кінула хадзіць на споведзь, кінула хадзіць да касьцёлу, кінула наогул верыць богу" (вучаніца—16 год—полька з Полацку). 17-гадовая школьніца з в. Малышэічы апавядае: „Калі скончыла 3 групы пачатковай школы, хацела вучыцца далей. Матка ня мела сродкаў і ня хацела аддаваць мяне ў 7-годку. Цэлыя вечары я з верай малілася, каб „бог даў", і мяне аддалі—у сямігодку. Нічога не дапамагло. Я засталася дома і з гэтага часу ня веру ў бога". „Калі мне было гадоў з 8", — успамінае адзін асьпірант - яўрэй, выхаваны ў рэлігійным духу, — я быў цьвёрда ўпэўнены

ў існаваньні бога і ўвесь час праводзіў за гульнёй, лекцый не рыхтаваў, а ўвечары маліў сьвятых, каб хто-небудзь з іх вывучыў за мяне. Пасьля двох тыдняў такіх малітваў мае „посьпехі“ выявіліся. Я ў першы раз на ўласнай скуры адчуў, як можна здацца на бога і верыць у байкі аб ім“...

Тут канечна трэба адзначыць, што калі цяжкае становішча і раптоўнае няшчасьце, як мы бачылі, часта зьяўляецца прычынай пералому да бязбожжа, дык выпадкі збаўленьня ад пагрозы няшчасьця часта аддаюць несьвядомы розум пад уладу рэлігійных забабонаў накшталт таго 55-гадовага селяніна з Самахвалавіч, што паведамляе аб двох выпадках, якія канчаткова і беззваротна пераканалі яго ў існаваньні ўсемагутнага бога. „Калі мне было 37 г. і быў я ў дарозе, мне захацелася курыць. Быў вельмі моцны мароз, я прыхіліўся да дупля дрэва, закурыў і заснуў. А мароз быў у 27°. Толькі я заснуў, як мне прысьніўся нябожчык бацька. Ён мяне будзіць і кажа, каб я падняўся, інакш прападу. Я абудзіўся і хутка пайшоў. Я зразумеў, што мяне выратаваў бог... Другі выпадак быў, калі на вайне я езьдзіў на двухколцы. У двухколку трапіў знарад, друхколку і каня разьбіла дашчэнту, а я застаўся цэлы. Я пабачыў, што мяне выратавала нейкая нябачная сіла, бо знарад ня мае літасьці“. „Дактары мяне лячылі, лячылі, не палепшала, пачаў богу маліцца—ачуняў“,—паведамляе селянін-паляк 34 г. І нават 34-гадовая настаўніца з вышэйшай адукацыяй апавядае аб тым, што пад уплывам цяжкай хваробы ў яе адбыўся пералом ад бязбожжа да веры...

Але такія адказы—выключэньні. Як правіла, няшчасьце, напаткаўшае веручага, дарэмнасьць яго малітвы да бога адкідае гэтага веручага ад рэлігіі, робіць яго бязбожнікам.

# ВАЙНА І ЎПЛЫЎ ЯЕ НА РЭЛІГІЙНАСЬЦЬ.

Імпэрыялістычная бойня зьявілася фактарам разрыву з рэлігіяй для шмат каго з веручых. Яна навочна выявіла перад масамі ролю рэлігіі, як дапаможніцы драпежнага капіталу, арганізаваўшага самае зьверскае зьнішчэньне мільёнаў людзей. Яна зыркім сьветам асьвятліла агідны твар духавенства, якое імем бога бласлаўляе крывавую оргію, наладжаную капіталістычнымі ўладарамі нявольнікаў. Вось чаму вайна раскрыла вочы на сапраўдную цану рэлігіі шмат каму з тых, хто раней быў яе шчырым прыхільнікам. Анкета наша паказала, што 3,2% ранейшых веручых прышло да бязбожжа праз вайну.

У большасьці выпадкаў гэта людзі, самі быўшыя на вайне і на свае вочы бачыўшыя сапраўдную ролю рэлігіі ў процэсе чалавечай бойні. 44-гадовы селянін з в. Пераналочкі Коханаўскага раёну апавядае, што ў яго адбыўся рэзкі пералом да бязбожжа, выкліканы „ашуканствам папоў і розных ахвіцэраў, якія гналі нас пад кулі, а самі ня ішлі, угаварваючы нас, што на тым сьвеце трапім у рай. Я зразумеў, што рэлігія—мана, якою нас заблытваюць на карысьць розных багатыроў“.

„Я адышоў ад рэлігіі з прычыны тых падзей, што давялося пабачыць на вайне 1914 г., калі папы ўрачыста з малебнамі накіроўвалі нас ў бойку, а самі п‘янствавалі з генэраламі. Я зразумеў што абазначае папоўскае рабаваньне і шальмоўства“ (селянін 38 г. з в. Кіявічы). Саўслужачы ўдзельнік вайны піша: „Пералом да бязбожжа ў сапраўдным сэнсе слова быў у мяне ў той момант, калі я пабачыў, што папы, якія з блаславенствам пасылалі на фронт забіваць людзей, самі асядалі ў тыле. Да вайны з пенай на губах даводзілі, што нельга забіваць, а тут адразу сталася магчымым рабіць гэта“...

Гэта ўсё адказы людзей, якім вайна відочна паказала, якую цану маюць гуманныя казаньні духавенства і якія справы хаваюцца за фальшыва-сьвятошанскімі словамі рэлі-

гійных профэсіяналаў. У вялікай колькасьці быўшых на вайне яна зьнішчыла ўсялякую веру ў сусьветнага ўладара, які дагэтуль у іх уяўленьні сумяшчаў мораль, справядлівасьць, дабро. Гэта фікцыя адразу зьнікла ў крывавым хаосе вайны. „Тысячы людзей малілі бога, каб ён ратаваў іх ад сьмерці і ўсе яны гінулі ў жудасных мучэньнях... І пасьля гэтага ці можна было верыць? Я пракляў бога, узьненавідзеў яго“ (прыказчык 36 г., м. Сяліба). „Мой пералом быў выкліканы сусьветнай вайной, калі ў імя бога гінулі сотні тысяч людзей, а яму да гэтага ня было ніякай справы“ (селянін 44 г. з в. Падвалочнай). „Калі быў у арміі“, — кажа другі селянін з в. Кураеды, — „я пабачыў, што і тыя, хто маліўся, і тыя, што ня верылі ў яго, аднолькава гінулі, і я кінуў верыць“. Вось што апавядае селянін 35 г. з в. Верасьніцы Тураўскага раёну: „Калі нас забралі на вайну, мы зразумелі, што вера — мана, што яна карысна толькі для розных капіталістых, папоў і кулакоў. Папы ўгаварвалі нас сьмела ісьці на ворага і забіваць яго, тым часам у ворагаў былі такія самыя гутаркі ад іх папоў. Мы думалі, што няма праўды ў веры, калі бог любіць толькі рускіх людзей, а нямецкіх не і г. д. А нам казалі, што бог адзін на ўвесь сьвет, а немцаў таксама пераконвалі, што бог іх любіць і ім дапамагае ваяваць. Вось такім чынам у мяне і зьявілася думка супраць таго, што існуе бог і ўсё гэта толькі ашуканства“...

Само сабой зразумела, што ўплыў вайны ішоў значна далей за тых асоб, якія самі прымалі ўдзел у ёй. У яе крывавым сьвятле шмат людзей выхаваных і выгадаваных у абставінах богашанаваньня з жахам адступіліся ад алтароў боскіх. Работніца Віцебскага фанернага заводу, верыўшая ў бога, як у „самае лепшае, што ёсьць“, гэта работніца кажа, што калі яна пабачыла „сьвяшчэньнікаў“, якія блаславілі ў 1914 г. ішоўшых на фронт салдат, і калі яна думала, як адны веручыя будуць забіваць другіх такіх самых веручых, уся яе вера „была як рукой зьнята“... 48-гадовая

сялянка-яўрэйка з Негарэлага апавядае, што калі ўзялі на вайну яе сына і ён там загінуў, яна пераканалася, што бога няма: „Інакш ён не дапусьціў-бы такую несправядлівасьць“... „У мяне муж загінуў на вайне, я ня кінула маліцца, адарвала сыну нагу, я ня кінула маліцца, загінуў другі і апошні сын, тады я выкінула абразы і сказала—„Гэта ня бог, а злодзей“. Больш ня веру“ (адказ сялянкі 56 г. з в. Кармазы).

Вось якую бязьлітасную прадметную практыку давала вайна веручым і дзякуючы гэтай цяжкой практыцы шмат іх зрабіліся пераконанымі і актыўнымі бязбожнікамі.

## УПЛЫЎ РЭВОЛЮЦЫІ.

Улічыць уплыў рэвалюцыі, як фактар бязбожжа, вельмі цяжка з прычыны таго, што цэлы рад зьяў, ахарактарызаваных у нашых анкетах, як фактары павароту да атэізму, ёсьць вынік рэволюцыі. Такім чынам усе тыя з дасьледваных, хто кажа, што іх рэлігійныя пераконаньні зьнішчыла антырэлігійная пропаганда, знаёмства з атэістычнай літаратурай, навучаньне ў савецкай школе, выяўленьне рэлігійнага ашуканства, контр-рэволюцыйная роля духавенства і г. д., і г. д., спыняюцца на выводных ад рэволюцыі фактарах. Яны зазначаюць на прычыны непасрэдна абумовіўшыя іх адыход ад рэлігіі, прычым, бязумоўна, разумеецца, што гэтыя прычыны ў сваю чаргу абумоўлены рэволюцыяй, якая пазбавіла рэлігію яе прывілеяванага стану ў дзяржаве і прынесла нячуваны рост палітычнага і культурнага роўню мас.

У гэтых радкох мы спыняемся выключна на тых адказах, у якіх ёсьць непасрэднае спасыланьне на рэволюцыю, як на прычыну разрыву з рэлігіяй.

Асноўны мотыў, які дамінуе ў адказах гэтага роду, ёсьць у тым, што рэволюцыя прынесла апытанаму тыя зьмены ў яго матар‘яльным становішчы, якіх ён з году

ў год дарэмна чакаў ад бога. „Колькі я ні верыў у бога“,— піша селянін - беларус 37 г. з в. Скароднае,—„ён не дапамагаў, а прышла Кастрычнікавая рэволюцыя і дапамагла“. Батрак 43 г. з в. Капейка піша: „Быў пералом з рэволюцыяй. Калі прагналі дармаедаў, адразу зрабілася лягчэй жыць. Вось ён наш бог—рэволюцыя, падумаўся. А паны вялі нас у цемру, каб абараняць цара і бацькаўшчыну. Вось і зьявілася для мяне новае разуменьне веры“. „Мае ранейшыя адносіны да рэлігіі з 1917 г. зусім зьмяніліся“, — кажа сэзоньнік-цясьляр 42 г. з в. Жадні,—„пры рэволюцыі я зусім перайшоў да бязбожжа і зразумеў, што папы не дадуць нам жыцьця на зямлі і на небе, як яны абяцаюць, а жыцьцё дадуць толькі працоўныя ўсяго сьвету, але не папы, якія самі не працуюць, а толькі гатовае зьядаюць“... „Думаю, што пры савецкай уладзе ня трэба маліцца, бо працоўнаму чалавеку ёсьць магчымасьць палепшыць сваё жыцьцё і без малітваў“ (адказ кухаркі 32 г., няпісьменнай з в. Журавічы). „Да Кастрычнікавай рэволюцыі я верыў у бога і нічога з гэтага ня вышла, а цяпер ня веру і жывецца лепш“ (пячкур 29 г. з в. Вялікія Лукі).

Другія адказы спасылаюцца не на паляпшэньне матар‘яльнага становішча апытаных у часе рэволюцыі, але на той агульны зрух, які зрабіла ў сьветапоглядзе мас рэволюцыя і замацаваньне савецкай улады ў БССР. „Пералом мой да бязбожжа адбыўся тады, калі бальшавікі занялі Менск, калі я начытаўся савецкіх кніжок і пабываў на комсамольскіх сходах“ (кур‘ер 28 г. з Менску, скончыў народную школу). Хлебапёк-яўрэй 34 г. з Мсьціслаўлю кажа: „Рэволюцыя пераканала, што калі ёсьць капітал, дык ёсьць і бог, няма капіталу, няма і бога. Рэволюцыя раскрыла вочы цёмнай масе, якая была асьлеплена богам і рэлігійнасьцю“... „Калі я вярнуўся з аўстрыяцкага палону ў 1918 г.“,—апавядае селянін - украінец 36 г. з в. Бярэзін на Гомельшчыне,—„дык пачалі бальшавікі ўскрываць мошчы сьвятых, і сам пачаў разьбірацца ў сьвятых кнігах. Цяпер я поўны бязбожнік,

сам разгледзеў закон божы і знайшоў шмат хлусьні і ня выконваю ніякіх абрадаў, хоць я і беспартыйны".

Документам выключнай цікавасьці зьяўляецца анкета былога рабіна. Яму 62 г. 6 гадоў вучыўся ў славутным Валожынскім ешыбоце—цытадэлі яўрэйскага клерыкалізму, потым займаўся самаадукацыяй, каб быць рабінам. У 15 год пад уплывам чытаньня літаратуры прасьветаўцаў-маскілім у яго зьявіліся першыя хістаньні адносна рэлігіі, але яны хутка заглохнулі. У 32 г. ён зрабіўся рабінам м. Нова-Быхава і быў ім на працягу 25 год. У 1924 г. выракся рабінства і рэлігіі. На пытаньне аб прычыне пераломy даў наступны адказ: „Пералом быў выкліканы рэвалюцыяй і агітацыяй бальшавікоў. Я пачаў думаць, ці праўду кажуць бальшавікі аб шкоднасьці рэлігіі і пабачыў, што праўду. Я пераканаўся, што рэлігійныя паданьні супярэчаць навуцы. Тое насеньне скептыцызму, якое трапіла мне ў душу, калі мне было 15 год, хутка пачало прарастаць. Рэволюцыя выклікала ў мяне сілы атэізму, якія драмалі скрыта. Спачатку я пачаў адыходзіць ад абрадавай рэлігіі і разглядаць сусьветную пантэістычна, як Сьпіноза. Так цягнулася год - два, потым я пачаў расчароўвацца ў рэлігіі наогул, у 1924 г. кінуў рабінства і канчаткова разарваў з рэлігіяй. Мне вельмі балюча, што ўсё маё жыцьцё было перапоўнена рэлігіяй і я не магу даваць сваім бацьком, што дзякуючы таму духоўнаму выхаваньню, якое мне далі, маё жыцьцё загублена"...

Гэты „чалавечы документ" добра паказвае, якая вялікая распрыганяючая сіла рэволюцыі і як яна вырывае з павуціньня рэлігіі нават яе служак, калі яны толькі здольны разумець навакольнае і ўзьняцца хоць крыху вышэй сваіх скурных інтарэсаў. Прынамсі такія бягуны ад аўтароў босскіх—служкі рэлігіі налічаюцца ў нас тысячамі...

Трэба сказаць яшчэ, што ёсьць адказы асоб, якіх рэволюцыя штурхнула ад бязбожжа да веры. Праўда, такіх адказаў мы зарэгістравалі ўсяго 3, але характэрна, што яны сустракаюцца. Два адказы даны пазбаўленымі волі, адзін—

навуковым працаўнікам. Вельмі характэрна, што ўсе яны рознымі словамі гавораць пра адно, што рэволюцыя „разбэсьціла масы“, што яна „пасеяла распусту“, што яна „зьнішчыла мараль“.

Адным словам, гэта адказы тых, каму патрэбны бог паліцэйшчыны. Пабачыўшы зьнішчанай зямную ўладу, яны захацелі ўлады нябескай, якая здолее трымаць у „страху і пакоры“ цёмны і зьняволены просты люд. Гэтыя адказы— лепшы паказальнік таго, як жыцьцёва - патрэбна рэлігія эксплёататарам рознай масьці...

## АНТЫРЭЛІГІЙНАЯ АГІТАЦЫЯ І ПРАПАГАНДА.

Рад дасьледваных непасрэднай прычынай адыходу ад рэлігіі лічаць антырэлігійную агітацыю і прапаганду, якія разгарнуліся ў краіне пасьля Кастрычніка.

Такіх адказаў па групе „а“ мы, напр., налічылі 22,1%. Шмат з дасьледваных кажуць, што наша агітацыя наогул упяршыню прымусіла іх падумаць над пытаньнем аб існаваньні бога, другія падкрэсьліваюць, што яна паглыбіла і закончыла яшчэ раней насьпеўшы крызіс. „У часе грамадзянскай вайны“,—апавядае селянін 22 год з в. Ігрушка,— „пабачыўшы бязбожныя плякаты, паслухаўшы некалькі антырэлігійных дакладаў, пачаў вельмі цікавіцца пытаньнем, ёсьць бог ці няма. Я пачаў шукаць адказу на сваё пытаньне ў кніжным матар‘яле. Шмат чытаў як навуковых кніжок, так і біблію, і такім чынам, параўнаўшы навуку з бібліяй, я пераканаўся ў справядлівасьці навукі, адмаўляўшай існаваньне бога“. Саўслужачы 23 г. беларус з Пухавіч, піша: „З рэлігіяй разарваў пад уплывам антырэлігійнай прапаганды, якую праводзіла ячэйка бязбожнікаў. Схадзіўшы на даклады ячэйкі, я сам увайшоў у яе склад“ Селянін - беларус 60 г. з с. Гарадзец апавядае, што выпадкова зацікавіўся адным № часопісу „Бязбожнік“ і далей пачаў сыстэматычна чытаць гэты часопіс. „З кожным прачытаным нумарам мая

вера пачала зьмяншацца і ўрэшце я зусім страціў яе". Саўслужачы 54 г., Менск, піша: „Мне давялося быць на антырэлігійным дыспуце. Слухаў мітрапаліта Ўведзенскага. Здавалася, што ён праўду кажа. Потым пачаў гаварыць профэсар Вольфсон. Празнаў, што і ён праўду кажа. Каб разабрацца, пачаў чытаць навуковую літаратуру і адышоў ад веры".

Шмат анкет падкрэсьліваюць, што наша антырэлігійная пропаганда вядзецца не ў патрэбным разьмеры, што яна часта павярхоўная, што дакладчыкамі па рэлігійных пытаньнях выступаюць ня досыць кваліфікаваныя і аўторытэтныя асобы, што яе трэба паглыбіць і пашырыць.

Служачы-беларус 43 г. з Жлобіну піша, напр.: „Вельмі пажадана слухаць на антырэлігійным фронце людзей з цэнтраў—адукаваных. Мясцовыя працаўнікі, хоць і партыйцы, слабыя,—яны сваімі выступленьнямі ствараюць адваротны пажаданаму настрой. На працягу апошніх трох год я памятаю добры даклад прыежджага профэсара, усе мясцовыя выклікалі нуду, ніхто і слухаць ня хоча"... Селянін 28 г. з в. Чурылы, актыўны бязбожнік, кажа: „Некаторыя нашы агітатары толькі лаюць бога. Ад гэтага ніякай карысьці. Сяляне да гэткіх ня маюць прыхільнасьці. Ім трэба навукова давесьці, што бога няма. Трэба ў вёску больш настаўнікаў і савецкіх дактароў, каб калдуны і бабкі-шаптухі кінулі ашукваць сялян. Сяляне паверацць толькі фактам". Саўслужачы беларус 35 г. з Віцебску, кажа, што больш трэба весьці антырэлігійную пропаганду пад кіраўніцтвам добрых дакладчыкаў, бо я быў сьведкай таго, як на некаторых дакладах адказваючы на пытаньні малады дакладчык так заблытваўся, што за яго было сорам. Работа ў гэтым кірунку мусіць быць пашырана, асабліва сярод жанок рабочых і служачых".

Мы бачым, што наша антырэлігійная пропаганда можа даваць і дае вельмі значныя вынікі. Пад уплывам яе разыходзіцца тэолёгічны дурнап'ян, ахапіўшы мазгі сотняў тысяч

людзей. Але ў той-жа самы час зусім зразумела, што маса пачынае вымагаць ад пропаганды значна большага. Гэта абазначае, што пропаганда павінна быць узьнята на патрэбны навуковы ровень, што ёй на дапамогу павінны быць пастаўлены кадры тэорэтычна адукаваных, кваліфікаваных, марксыцка вытрыманых працаўнікоў.

## ХІСТКІЯ Ў ВЕРЫ.

Сярод дасьледваных нашай анкетай ёсьць пэўная колькасьць асоб, якіх мы не маглі залічыць да той ці другой з дзьвёх асноўных вялікіх груп, выяўленых намі, г. зн. ні да веручых, ні да бязбожнікаў. А дзеля таго намі вылучана 128 асоб, якія аб сваіх адносінах да рэлігіі далі такія няпэўныя адказы, што мы ня можам кваліфікаваць іх ні як веручых, ні як бязбожнікаў. Мы іх занесьлі ў асобную рубрыку тых, што хістаюцца.

Вера людзей, якія хістаюцца, падарвана ў самай аснове. Але яны яшчэ няздольны зрабіць апошні крок да разрыву з верай. У іх не хапае адвагі перайсьці на позыцыі бязбожжа, яны аслупянелі на раздарожжы, іншы раз прабуюць яшчэ гаварыць аб сваёй веры, але яна даўно парай зрабілася. Частка іх мітушыцца між верай і бязбожжам, робячы, як той маятнік, хістаньні ад выпадку да выпадку ў залежнасьці ад тых ці іншых абставін. Сярод такіх нявытрыманых людзей большасьць, натуральна, прыпадае на старэйшыя ўзросты: так асобы ад 40 да 50 г. складаюць сярод іх 24,2%, старэй 50 г.—22,7%, або амаль палова ўсіх, тых, што хістаюцца, мае ўзрост вышэй 40 год. Па соцыяльным становішчы яны ў пераважнай большасьці сяляне — 80,8%. Пэўную частку іх складаюць батракі (4,8%), саматужнікі (3,2%), служачыя (3,2%). Іншыя ў гэтай групе прадстаўлены слаба. Асьветны ровень большасьці гэтай групы — пачатковая школа і хатняя асьвета (68,3%). Няпісьменныя скла-

даюць 15,2%, скончыўшыя сямігодку 12,5%, дарэволюцыйную школу 2,4% і асобы з вышэйшай адукацыяй 1,6%.

Як-жа характарызуюць прадстаўнікі гэтай групы свае адносіны да рэлігіі? Падамо рад тыповых адказаў.

„І веру, і ня веру, сам ня ведаю. У царкву не хаджу, не спявадаюся, не пашчу"... (селянін-беларус, 56 год з Чырвонай Слабады, Бабруйшчына).

„І веру, і ня веру, бо за апошні час мая вера захісталася" (каваль, яўрэй, 32 г., м. Гарадзец). „Сам ня ведаю, веру ці не" (селянін-беларус 44 г. з в. Чурылы Койданаўскага раёну). „Хоць і лічу сябе веручым, але апошні час пачынаю адчуваць, што робіцца са мною відочная зьмена. Ня так старанна выконваю пасты, у царкву ня так рэгулярна хаджу, як раней. Зірнеш на людзей і падумаеш: Чым я горшы ад іх?" (селянін-беларус 35 г., Бабруйшчына).

„Больш веру, як ня веру. Сяродка на палавінку" (саўслужачы 37 г. Віцебск). „Цяпер я хаджу яшчэ ў сынагогу, але лічу, што трэба ўжо адмовіцца. Я ўжо не зьяўляюся прыхільнікам рэлігіі. Пералом надыйдзе, як запішуся ў колектыў" (чорнарабочы-яўрэй, 50 г., м. Журавічы, Магілеўшчына). „Людзі вераць, і я веру. Людзі ня вераць, і я ня веру" (селянін 25 г. з Балочыц). „Ня ведаю. Куды масы, туды і я" (селянін 21 г. там сама). „Я ня ўпэўнены, ёсьць бог ці няма. Пад уплывам гэтага і ня веру" (сялянка-беларуска 22 г., м. Пухавічы). „Каб добра дазнаць гэта, трэба было-б выклікаць папа на дыспут". „Калі слухаеш бяседы вучоных, згаджаешся з імі, а потым старое перамагае і лічыш, што бог усё-ткі ёсьць там" (селянін-беларус 40 г. в. Чырвоная Слабада). „У думках аб богу заблытаўся. Абрады выконваю ня зусім. Ледзь-ледзь схіляюся да бязбожжа" (селянін-беларус, 42 г., в. Цясава). „Добра не магу разабрацца ў гэтым пытаньні. Людзі больш за мяне вучоныя кажуць цяпер, што бога няма. А калісь бога і царкву паважалі" (сялянка-беларуска 41 г. з Бабруйшчыны).

„Стаю на раздарожжы--ня ведаю, веру ці не“ (селянін-беларус 42 г., Сьмілавіцкі раён). „Патроху пачынаю кідаць веру“ (хатняя гаспадыня, яўрэйка 19 г., Коханава, Аршаншчына). „Адносіны да рэлігіі так сабе, ні туды, ні сюды“ (хатняя гаспадыня, беларуска, 26 г., Слуцак). „Знаходжуся ў роўнавазе да рэлігіі“ (вучань сямігодкі, 15 год, Бешанковічы, Віцебшчына). „Не магу зразумець, каму верыць—бібліі ці сучаснаму бязбожжу“. (Селянін, 36 г., в. Багданаўка). „Веру, але трошкі“ (кравец, яўрэй—30 г., м. Сяліба). „Пакуль што веру, але калі бог не палепшыць маё жыцьцё, дык хутка кіну верыць“ (селянін, 44 г. з в. Чурылы). „Як не змагу давесьці, што бог ёсьць, так не магу сказаць, што яго няма, але калі буду думаць, што няма, а выйдзе, што ёсьць, дык гэта будзе горш, як наадварот. А таму часткова веру“ (савецкі служачы — яўрэй 40 г., Менск). „Невядома каму верыць. Поп кажа адно, евангэлістыя другое, а комуністыя зусім іншае, і ня ведаеш, каму верыць“ (сялянка 55 год з в. Гарласенава). „Наконт рэлігійных адносін і веры ў бога я знаходжуся ў нэўтральнасьці“ (селянін 25 г. з пасёлку Асавок).

З безьлічы аналёгічных заяў я падаў рад тыповых, зробленых пры дасьледваньні нястойкім элемэнтам. Што характэрна для ўсіх гэтых заяў? Па-першае тое, што яны зроблены з большага асобамі, моцна і доўга раней вераваўшымі. Па-другое, што ў гэтых асоб пад уплывам тых ці іншых фактараў пачаў пад нагамі рушыцца той рэлігійны грунт, на якім існавала вера. Па-трэцяе, што ў іх не хапае рашучасьці канчаткова разарваць з рэлігіяй.

Фактары, якія выклікаюць у апытаных хістаньні, у асноўным падобны да тых, што паводле даных нашай анкеты нагул абумоўляюць пералом ад веры да бязбожжа. Мотывізацыя тут не адрозьніваецца ад той, якую маем мы ў анкетах бязбожнікаў. Розьніца толькі ў тым, што ў данай групе той ці іншы фактар ня прыводзіць да рэзкага і рашучага пера-

лому. Ён толькі выклікае „развагі“, „нявыразнасьць“, „сумненьні“, „хістаньні“ і г. д.

Такім чынам цікавасьць, якую мае для нас гэта група, ёсьць у вырашэньні пытаньня, чаму ўсе гэтыя нястойкія, няўпэўненыя, засеўшыя на раздарожжы, веручыя „часткова“, „трошкі“, „ледзь-ледзь“, „нэўтральныя“ да рэлігіі, самы ня ведаючыя, вераць яны ці не,—чаму гэтыя людзі, веру якіх ужо разьела іржа рэлігійнага скепсісу, чаму яны не разрываюць з рэлігіяй канчаткова, не вызваляюцца з-пад яе прыгнёту. Чаму некаторыя з іх, адплыўшы ад берагу рэлігійнасьці, ніяк ня могуць прыплысьці да берагу атэізму, хоць іншы раз і самі разумеюць усю недарэчнасьць і балючасьць гэтага становішча.

Анкета паказала, што інэрцыя шматгадовай традыцыі, прызвычаенасьць з маленства, урэшце ўпыў вакольнага консэрватыўнага асяродзьдзя—зьяўляюцца тымі асноўнымі сіламі, якія трымаюць у пакоры рэлігіі тых, хто ўжо ад яе пачаў адыходзіць, хто ўнутрана адчуў і нікчэмнасьць і шкоднасьць рэлігіі. Пры гэтым адна частка хісткіх у веры зусім адганае ад сябе думку аб магчымасьці поўнага разрыву з рэлігіяй, другая-ж лічыць, што гэты разрыў няўхільны, але прабуе аддаліць надыход няўхільнага.

Так, селянін 33 г. з в. Дзьмітраўка Цэрахоўскага раёну піша: „З уласнай практыкі я расчараваўся ў рэлігіі, але яшчэ веру ў бога па звычцы і пад моцным уплывам маткі“. 44-гадовая жанчына з м. Насовічы, выхаваная ў сям'і дробнага гандляра, вырасла ў атмосфэры веры ў ірэальнае жыцьцё, у прыход мэсіяша, у сьвятых, чартоў, дамавікоў і г. д. Цяпер, на пятым дзесятку яна адганяе, як надаедлівую муху, усялякую крытычную думку адносна бога. „У існаваньне бога веру па звычцы“,—кажа яна,—„бо мяне так выхавалі бацькі і ў маім узросьце не хачу ламаць боскіх звычаяў“. Хатняя гаспадыня 29 г., беларуска, з сярэдняй асьветай з Менску кажа: „Вера моцна пахіснулася, але зьнішчыць тое, што ўсасалася ў кроў, цяжка“. Мікроб рэлігійнасьці

яшчэ больш устойлівы ў людзей пажылага ўзросту. Іх адказы ў розных формулёўках гавораць прыблізна тое, што сказала 52 гад. сялянка з в. Царыньня: „Веру ў бога таму, што і мой дзед, і мой бацька верылі, значыць і я павінна верыць“. Нішто не перашкаджае рабіць такія заявы пасьля таго, як на пяць радкоў вышэй было сказана: „Наконт бога пачала моцна хістацца“.

Сілай, якая консэрвуе рэлігійную традыцыю, галоўным чынам, у вёсцы і мястэчку, зьяўляецца нежаданьне ўступіць у конфлікт з так званай „грамадзкай думкай“. Гэтая акалічнасьць часта трымае на ланцугу рэлігіі найбольш адсталыя элемэнты, хоць-бы вера іх і была зусім расхістанай. 34-гадовая сялянка з в. Волмы верыць „для прыстойнасьці, каб людзі языкамі не трапалі“. Селянін-літовец, 27 г. з в. Садонскай Лупалаўскага раёну, лічыць сябе няверучым, але не падае віду, „каб рэлігійныя людзі з мяне не сьмяяліся“. 50-гадовы селянін з Бабруйшчыны ўсё яшчэ верыць, „каб пазбыцца кпін з боку суседзяў“. Кравец-яўрэй, перажыўшы ў рэволюцыйныя гады сур'ёзны перолом да бязбожжа, абвяшчае сябе веручым, каб „падтрымаць грамадзкую думку“. 27-гадовая дзяўчына — доктар піша, што адносіны яе да рэлігіі абыякія, але ад веры яна не адмаўляецца, бо жыве ў сям'і, дзе выконваюць рэлігійныя абрады, а „з ваўкамі жыць, павоўчаму выць“, дадае яна. І вось яна, савецкі доктар, выхаваная савецкім вузам, вые павоўчаму для большай славы боскай...

Побач з такімі асобамі, вера якіх у корані струхлела, але якія сымулююць рэлігійнасьць з меркаваньняў ня ўнутранага парадку, сустракаюцца адзінкі, якія ўнутрана беспарадныя ў вырашэньні высунутай перад імі рэлігійнай проблемы. Яны чакаюць для гэтага штурхача зьне. „Я чалавек шэры“, піша, напрыклад, 46-гадовы селянін з в. Забалоцьце Асіпавіцкага раёну, — „і не разьбіраюся ў гэтым. Калі ўсе вераць, дык і я веру, а калі-б мне добра растлумачылі гэта пытаньне, тады-б я кінуў верыць у бога“. „Цэлыя дні, іншы

раз і ночы думаю над гэтым пытаньнем, ці ёсьць бог, і яго праклятага вырашыць не магу“, піша настаўнік 31 г. з Магілеўшчыны.

Але гэта, паўтараю, выключэньні. Пераважная большасьць гэтых людзей знаходзяцца на раздарожжы з меркаваньняў ня ўнутранага характару, якія мы вышэй характарызавалі. І ня будзе памылкай гэту большасьць назваць рэлігійнымі сымулянтамі.

## ВАЯЎНІЧЫЯ РЭЛІГІЙНІКІ.

Побач з нястойкімі людзьмі, якія ўжо знаходзяцца ў стадыі адыходу ад рэлігіі, сярод дасьледваных намі выкрышталявалася невялічкая — некалькі дзясяткаў чалавек — група ваяўнічых рэлігійнікаў. Ядро гэтае групы складаюць рэлігійныя фанатыкі, сьлепа і бязумоўна веручыя ў бога, адганяючыя ад сябе ўсялякую крытычную думку. У большасьці выпадкаў гэта тупыя, несьвядомыя старыя людзі, шамкаючыя ў сваіх адказах словы самаахвярнай пакоры госпаду - богу, злосна пагражаючыя бязбожнікам усімі жудасьцямі, якія толькі здольна намаляваць іх фантазія, запаланёная рэлігійнымі мітамі, біблейскімі і евангэльскімі паданьнямі. Азнаёмімся бліжэй з гэтай галярэяй ваяўнічых рэлігійнікаў.

Вось 66-гадовы малапісьменны млынар, які бачыць „сьляды бога ва ўсёй прыродзе“... Ён на 57 г. жыцьця (відаць, калі адабраны быў млын) пачаў чытаць евангэльле, і гэта евангэльле „даравала яму боскую веру ў жывога бога, якому няма пачатку і канца, які ўсім кіруе, якому ўсё пакорна і які ўсяму дае жыцьцё“. Цяпер ён радуецца свайму пераконаньню, якое „пазбавіла яго распуснага жыцьця“.

Вось 56-гадовы пазбаўлены волі ў Папраўчым Доме, не сказаўшы сваёй профэсіі, піша: „сьвядома веру ў бога, як у адзіны якар паратунку і пацехі“ і абвяшчае: „застануся веручым у бога да канца свайго жыцьця“. Вось 62-гадовы

селянін з в. Карачоўшчыны Слуцкага раёну. Ён адчувае бога як нешта, усюль існуючае і карыснае для яго. Яго крыўдзіць самая думка аб магчымасьці рэлігійных хістаньняў: „Усё жыцьцё не зрабіў здрадніцтва і цяпер не зраблю яго“, кажа ён. „Думаю памерці ў сваёй веры, бо я ў богу, і бог у мне“, урачыста кажа ён. 45-гадовы селянін з хутара Ўгодзін, Пухавіцкага раёну, сын кулака, меўшага 60 дзесяцін зямлі, і па ўсіх даных сам кулак, адказаў: „Я верыў у бога і буду верыць, я нарадзіўся з богам і памру з ім. Бог стварыў мяне, а ня я бога“. „Няхай балбочуць комсамольцы, я і слухаць гэтага не хочу“, адбіваецца ад нялюбых бязбожнікаў 70-гадовая сялянка з Бабруйшчыны. Тое самое кажа і больш маладая прыхільніца господа-бога — 40-гадовая няпісьменная сялянка з в. Копічы (Могілеўшчына). „Бальшавікі кажуць, што няма бога, але ён моцна сядзіць на небе і ніхто яго адтуль ня скіне“. Некаторыя фанатыкі рэлігіі даходзяць да дрвінаў і візыянэрства. Яўрэй-кравец 81 г. з м. Гарадзец Рагачэўскага раёну апаведае, што яшчэ падлеткам ён сьлепа верыў, а калі чуў бязбожныя гутаркі таварышоў, дык адыходзіў, каб ня быць удзельнікам у іх граху. Усё жыцьцё сядзеў за кравецкай машынай і марыў зрабіцца „праведнікам“. І цяпер, перайшоўшы на дзевяты дзесятак, піша: „Часам бачу бога ў снах ў выглядзе агню. Некалькі разоў ён гаварыў са мною“. „Я хворая. У царкву хадзіць далёка, але мае ногі не баляць, я туды на скрыдлах лячу“ — піша сялянка 47 г. з Негарэлага. „Бог быў, бог ёсьць і будзе пасьля нас“, — сьцьвярдждае 45-гадовая хатняя гаспадыня з хутара Зяленка — „каб ня бог, дык невядома, дзе мы былі-б“. Вера ў бога зьяўляецца самым асноўным у маім жыцьці“, піша 43-гадовы кравец-яўрэй з Калінкавіч. Але ня толькі дажываючыя свой век старыя даюць абяцаньне трымаць веру да канца жыцьця...

Рэлігійная атрута часам трапляе і ў мазгі мяладога пакаленьня і атручвае яго фанатычнымі ідэямі. Сярод фанатыкаў, выяўленых нашай анкетай, можна сустрэць і 14-гадовую татарку, якая старанна наведвае мячэць, мысьліць бога ў вы-

глядзе „добрай бабулі — прыроды“ і раіць „усім вам верыць, бо інакш пападзеце ў пекла“. Між іншым, гэта маладая прыхільніца бога паведамляе, што яна была прыведзена да веры боскай сваім настаўнікам... Тут і 18-гадовая дзяўчына-каталічка, сялянка з в. Гарбузы, Койданаўскага раёну так, непараўнана ўпэўненая ў тым, што „усё добрае на сьвеце ад бога, усё дрэннае ад яго ворагаў“. Апавяданьні маткі, запаўняўшыя ўжо галаву пяцігадовага дзіцяці рэлігійнымі забабонамі, штогадовыя споведзі, імпозантнасьць касьцельнага набажэнства завербавалі маладую дзяўчыну ў армію лёкаяў госпада-бога. Тут і 24-гадовы селянін Клічаўскага раёну з Бабруйшчыны, які клянецца „шчыра верыць да самай сьмерці“ і г. д.

Сярод рэлігійных фанатыкаў, выяўленых нашай анкетай, асобнае месца займаюць сэктанты. Як мы ўжо падкрэсьлівалі, характарызуючы групу в. Балочыц, быўшую спэцыяльным об'ектам дасьледваньня, той сэктант, што запаўняе анкету, у большасьці выпадкаў выступае ў ёй, як ваяўнічы рэлігійнік. Ён ня толькі заяўляе аб сваёй рэлігійнасьці — ён ёю выхваляецца. Ён лічыць сябе ўзьнятым вышэй вакольнай бязбожнай, грахоўнай масы. Ён карыстаецца анкетай, каб выступіць ў ролі прапаведніка слова боскага, каб навучыць словам праўды гінучыя ў няверы душы. 33-гадовы евангэлісты (стаж з 29 г.) верыць „у найвышэйшага, які стварыў неба і зямлю“ і „бога я бачу праз разгляд яго стварэньняў“. Амаль у тых-жа словах кажа аб сваёй веры 18-гадовы пастух евангэлісты, таксама нядаўна трапіўшы пад уплыў сэкты. Трэці сэктант радуецца, што „з 1925 па 30 г. майго грэшнага жыцьця найвышэйшы творца навучыў мяне ўспрыяць евангэльле“. 23-гадовы селянін ужо 7 год належыць да сэкты баптыстых, „каб ратаваць сваю душу ад спрадвечнай цемры, каб быць сьвятым чалавекам і папасьці ў рай“. Характэрна для сэктантаў, што ўсе яны кажуць аб сваёй веры амаль у аднолькавых выразах, формулююць свае адносіны да рэлігіі адным штампам, карыстаюцца адным трафарэтам, відаць, запазыча-

ным у сэктанцкіх казальніках ці якіх-небудзь іншых „аўторытэтаў“.

Мы ўжо казалі, што сэктант, які запаўняе анкету, выступае часта ў ролі рэлігійната агітатара. „Веры ў бога ніколі не пакіну“—піша 28-гадовая евангэлістка,—„бо бог ёсьць наш збаўца і я заклікаю другіх рабіць памайму прыкладу“. „Усім трэба заняцца вывучэньнем евангэльля“, чытаем мы ў другой анкеце гэтай групы. „Трэба жыць як там напісана, і тады ўсе людзі на сьвеце будуць як браты“. Шмат анкет поўны заклікаў: „Ідзеце ў сьвет і ўсім кажэце евангэльле“. Ад гэтых заклікаў евангэлістыя часта пераходзяць да тэрорызацыі бязбожніка, да пагрозы яму ўсялякімі боскімі карамі: „Людзі забыліся на ўсемагутнага творцу. Паразумнейце і кайцеся, бо блізкі час другога прыходу хрыста“ (евангэлістка 53 г.). „Пабойцеся бога і вaздайце яму, бо прыдзе час суду яго і паклоніцеся творцу неба, зямлі, мора і крыніц“. (з анкеты 45-гадовага селяніна-евангэліста з в. Чадавічы Слуцкага раёну). Між іншым, такія „пагрозы“ сустракаюцца ня толькі ў евангэлістых, але і ў анкетах шмат якіх ваяўнічых рэлігійнікаў праваслаўнай, яўрэйскай, каталіцкай рэлігій. „Цяпер маладыя ня вераць у бога, але ён покуль што церпіць гэта. Пройдзе час і бог выйдзе з цярплівасьці. Тады заморыць усіх бязбожнікаў голадам і даведаюцца яны, што абазначае не прызнаваць бога“ (сялянка 55 г. няпісьменная).

Для ваяўнічых рэлігійнікаў характэрна, што яны ў пераважнай большасьці сваіх анкет ставяць пытаньне аб „прасьледваньні рэлігіі“, патрабуюць спыніць антырэлігійную прапаганду, вярнуць цэрквы, узятыя пад культурна-асьветныя ўстановы і г. д. Гэтыя патрабаваньні выстаўляюцца пад рознымі матывамі: „Ня вы будавалі, ня вам і адбіраць“. „Мы вам не перашкаджаем хадзіць у клюбы, вы нам не перашкаджайце хадзіць у касьцёл“. „Хто вам даў права лезьці ў нашу ўнутраную справу сумленьня?“ і г. д. Ёсьць спробы „абразуміць“ савецкую ўладу, давесьці ёй, што ёй нявыгодна змагацца з рэлігіяй. „Не чапайце цэркваў. Тады

лепш будуць слухаць вашых бязбожнікаў“. „Чым вам замінае рэлігія? Падаткі мы вам плоцім, а рэшты не чапайце. Гэта будзе лепш і для нас і для вас“. „Няхай савецкая ўлада друкуе евангэльле і сьвятыя кнігі. І нахай распаўсюджвае іх сярод народу. І народ будзе маліцца ў цэрквах за рабочую ўладу. І тады сяляне хутчэй пойдуць у колектывізацыю. Так вы хутчэй даб'ецеся сваёй мэты, ня тое, што бяз сэнсу лаяць рэлігію. Папоў-дармаедаў трэба гнаць, а нашай рэлігіі не чапайце“. (анкета 44-гадовага селяніна-бедняка з в. Кармазы, Старадароскага раёну).

Пераважная большасьць ваяўнічых рэлігійнікаў, выяўленых анкетай,—сяляне не паказаўшыя разьмераў сваёй гаспадаркі. Паводле некаторых пабочных даных, якія ёсьць у анкетах, можна лічыць, што ў значнай сваёй частцы яны належаць да кулакоў. Але далёка ня ўсе. Мы тут сустракаем і серадняка і, часта, бедняка. Ня мала рэлігійных фанатыкаў дае і мястэчка (у большасьці выпадкаў—саматужнікі, дробныя гандляры). Зрэдку сустракаюцца адзінкі-інтэлігенты. Характэрна анкета ад'ютанта госпада бога з дэклясаваных, які „верыў і будзе верыць, а на бязбожнікаў плюе“. Яму 23 г. родам з Варшавы. Паляк. Жыве ў Менскім Папраўчым Доме. Заняткі—хуліганства. Соцыяльнае пахаджэньне: бацька—злодзей. Прыхільнік каталіцкай рэлігіі. Бога мысьліць сьвятым духам. Анкету дапоўніў парнаграфічнымі „дадаткамі“...

Анкеты ваяўнічых рэлігійнікаў яскрава выяўляюць, што адной з асноўных крыніц, якая жывіць сучасную рэлігійнасьць, ёсьць няпрыняцьце рэволюцыі і пабудаванага ёю ладу жыцьця. Контр-рэволюцыйнае імкненьне процідзеяць будаўніцтву соцыялізму часта апранаецца,—аб гэтым сьведчаць шмат анкет—у рэлігійную вопратку. Да рэлігіі гоніць нездавальненьне вакольнымі падзеямі, разрыў з новым жыцьцём, неразуменьне і страх перад ім.

Былы чыноўнік, цяпер пэнсіонэр з Магілеву—аргумэнтуе сваю веру тым, што „разам са зьнішчэньнем рэлігіі зьявілася чарга каля крам“. 49-гадовы селянін з Балочыц кажа, што

„Савецкая ўлада ня добра робіць, абкладаючы нас падаткам. Калі жылі ў веры, нічога гэтага ня было. Кінулі верыць і зьявіўся падатак“. „Верыў і веру ў бога, ад тэтага-ж падатак не павялічваецца“, піша беларус-шавец 28 г. з. м. Уваравічы.

Вельмі яскрава формулявала настроі часткі веручых сялян 36-гадовая сялянка з в. Бохань Журавіцкага раёну, якая сказала: „Наогул усе сяляне вераць і выконваюць абрады, бо маюць уласную гаспадарку і баяцца, каб бязбожжа не пашкодзіла гэтай гаспадарцы“. У гэтым адказе ўся псыхолёгія дробнага сельска-гаспадарчага вытворцы з цэнтральным пунктам у яго сьветапоглядзе—уласнасьцю, з яго абмежаваным кавалкам уласнай зямелькі, сьветам, з яго залежнасьцю ад магутных стыхій прыроды, з нявольніцкім страхам пакрыўдзіць бога, кіруючага яго лёсам. І гэткі адказ не адзін. „Веру ў айца, сына і сьвятога духа і яны берагуць маю гаспадарку лепш усялякіх аграномаў і настаўнікаў“—так напісаў селянін-серадняк 46 г. з в. Новыя Вялічкі з Бабруйшчыны. І ў гэтых словах уся шматгадовая спадчына культываванай царызмам цемры, уся тупасьць, спароджаная ідыётызмам вясковага жыцьця пакаленьняў... „Калі верылі мы ў бога, тады ўсе былі сытыя і не стаялі ў чарзе за хлебам, а цяпер калі зьявіліся „бажаняткі“, дык трэба стаяць за паўфунтам хлеба“, кажа 47-гадовы селянін з той-жа вёскі і з-пад гэтых слоў праглядае раззлаваны твар рэлігійнага фанатыка, які злорадасна спэкулюе на нашых труднасьцях. І такіх добрая палова ваяўнічых бязбожнікаў. Яны, узьняўшы вочы да неба, сумуюць аб тым, што калі „мелі веру, дык ня было на зямлі цяперашняй распусты“. А другія больш шчырыя расшыфроўваюць, у чым гэта „распуста“... „Пералом ад бязбожжа да веры ў бога быў выкліканы ў мяне рэвалюцыяй.“—піша селянін 54 г. з Балочыц. Рэвалюцыя кідае ў абоймы бога ўчарайшых бязбожнікаў, калі яна выкідае іх з соцыяльнага сядла, калі яна пазбаўляе іх эксплёататарскіх магчымасьцяй і прывілей. „Ня веру ні ў бога, ні ў чорта,

асабліва ў колектывізацыю. Гэта—такі дурнап‘ян, што горш усялякай рэлігіі“,—піша 43-гадовы селянін з тых-жа Балочыц. Вось „дурнап‘ян“ колектывізацыі, відаць, не дае спакою шмат каму з адданых лёкаяў госпада-бога. „Трэба кінуць цяперашнае зло, паверыць у бога, пакаяцца ў грахох“,—праяшчае аўтар адной анкеты, 30-гадовы селянін. „Людзі кінулі веру, усё, што адрозьнівае разумнае стварэньне ад жывёлы і адгэтуль пайшлі ўсе навалы, усе няшчасьці, і ўсё зло, ад якога мы цяпер пакутуем“... Ад якога „зла“ пакутуе 46-гадовы сэктант, запоўніўшы анкету? На гэта пытаньне выразна адказаў яго сусед. „Калі прышла воля з яе распустай, пачаў схіляцца да веры, а з прычыны раскулачваньня зрабіўся канчатковы пералом у бок веры“. І сумуе гэты і дзесяткі падобных да яго кулакоў аб тым, што „прышоў зьвер, якому імя 666 і спраўджаны 13 разьдзел евангэльля і толькі бог і яго моц выратуюць нас“ (селянін 67 г. з Цімковіч).

Вось якавы контр-рэволюцыйны твар ваяўнічага рэлігійніка, які хаваецца ў дзесятках анкет гэтай групы.

---

## ВАЯЎНІЧЫЯ БЯЗБОЖНІКІ.

Анкета выявіла наяўнасьць сярод няверучых досыць значнае колькасьці ваяўнічых бязбожнікаў. Я разумею пад імі ня тых асоб, што формальна належаць да саюзу ваяўнічых бязбожнікаў, але тых, хто яскрава ўяўляе сабе ўсё соцыяльнае зло ад рэлігіі, хто лічыць патрэбным актыўна змагацца з гэтай самай рэакцыйнай ідэолёгіяй, адной з сур‘ёзных перашкод на шляху нашага соцыялістычнага будаўніцтва, і гэту барацьбу вядзе.

Гэту групу складаюць пераважна рабочыя, навуковыя працаўнікі, батракі. Вельмі значны процант з іх (прыблізна 60%) у свой час былі веручымі, пад уплывам тых ці іншых фактараў рашуча разарвалі з рэлігіяй і зрабіліся яе ворагамі.

У сваіх анкетах большасьць ваяўнічых бязбожнікаў ставіць пытаньне аб канечнай патрэбе бязупыннай барацьбы з рэлігіяй і спыняецца на тых ці іншых спосабах гэтай барацьбы, якія лічыць за больш мэтазгодныя. Пры гэтым ва ўсіх без выключэньня анкетах падкрэсьліваецца слабасьць нашай антырэлігійнай работы асабліва сярод сялянскіх мас.

Абураным протэстам супраць існуючай дагэтуль на вёсцы ўлады рэлігіі зьяўляецца заява, дасланая нам з анкетамі ад групы сялянскай моладзі сяла Стары Крупец. Заява вельмі характэрная і я лічу патрэбным падаць яе тэкстуальна:

„Мы группа молодежи, заслушав информационное сообщение представителя Белорусской Академии Наук, решили заполнить коллективно анкету, так как наши настроения одинаковы и мы их выражаем коллективно. К этому желаем дополнить, что работу антирелигиозную нужно вести во что бы то ни стало, ибо у нас староверы не токмо старики хотят верить, но заставляют этому повиноваться свое *чадо*, которые в самом деле находятся у них под гнетом, а так как комсомол наш очень слабый, то он не может никакими средствами с старовером справиться. Из верующих у нас людей очень мало, одни бабы ходят в церкви и мучают свое чадо попом и религией. Церковь в Старом Крупице держится в порядке и большая, а вот школы семилетки на 1500 дворов, что дает около 6500—7000 душ нашего общества нет, это не школа, а хижина, клуба у нас нет, а на тот, что строим средств и материалов не достаем, нардом малый, а церковь мы не можем взять, хотя нас и большинство неверующих молодежи и мужчин русских, но бабы поднимают такой шум, что и в самом деле их как будто режут, нужно этот очаг религии уничтожить; почему мы идущие к жизни должны подчинять свою волю меньшинству баб. Мы не делаем и не требуем насилия, но они меньшинство делают над нами насилие, использовывая доброту и последние осложнения советской власти. Мы не хотим, чтобы звонили колокола, почему их кучка звонит в праздник и хо-

тят, чтоб к ним шел и всякий *симулянт*, для которого бога нет, но есть укрытие и поп. Долой эту свору тушинских воров. Мы гнета не хотим, но не хотим, чтобы он и над нами тяготел. Помощь ваша должна нам быть в работе, особенно среди женщин и вы на опыте анкет можете выяснить социальные условия порождения и уничтожения религии, а также и то, среди кого больше надо вести работу, метод хороший, просьба результаты в газету, чтобы видно было, есть ли у нас гонение на религию по числу верующих и неверующих по анкетам. Группа от 15 до 21 года—30 человек".

Цэлы рад анкет, дасланых ваяўнічымі бязбожнікамі, патрабуе большай актывізацыі антырэлігійнай работы і ў асобку больш хуткай ліквідацыі дамоў рэлігійнага культу. „Трэба хутчэй канчаць з рэлігійным глупствам і забабонамі", піша навуковы працаўнік 37 г., паляк. „Вера і навука ня могуць ужыцца. Трэба рэлігію, папоў і ксяндзоў аддаць у музэй, як помнікі дагістарычнага (г. зн. дасоцыялістычнага) часу".

Навуковая працаўніца 27 г. піша: „Усіх сьвятых і багоў, пачынаючы ад ушанаваньня вады і агню аж да нашага часу, можна толькі зьмясьціць у гістарычны музэй, каб паказаць, колькі сілы і энэргіі дарэмна загублена людзьмі і нават трацiцца цяпер, покуль існуюць касьцёлы і цэрквы і тыя несьвядомыя людзі, што ходзяць маліцца. Трэба адарваць іх ад рэлігіі, каб яны зразумелі ўсю непатрэбнасьць і шкоднасьць рэлігіі".

Селянін-беларус 27 г. з в. Блічы кажа: „Трэба адабраць пустыя цэрквы і аддаць іх для нашай агульнай культурнай справы". Рабочы-беларус Дабрускай фабрыкі, 25 г., патрабуе „хутчэй скончыць з гэтым дурнап'янам і замяніць цэрквы клюбамі". Другі рабочы з той-жа фабрыкі, беларус 27 г., прызнае патрэбу „хутчэйануляваць рэлігію, якая зьнявольвае ў сучасны момант шмат людзей і затрымлівае ход да соцыялізму".

З в. Балочыц, што, як мы бачылі, зьяўляецца адным з найбольш злосных прытулкаў рэлігійнай інфэкцыі, намі атрымана анкета ад 24-гадовага селяніна, які піша: „Прашу Акадэмію Навук закрыць царкву і аддаць яе пад культурную ўстанову—гэта галоўнае, што я магу дадаць“. Сялькор Зьмітрок Ханютка з сяла Рудні Гарадоцкага раёну лічыць патрэбным, каб Акадэмія зьвязалася з сялькорамі і рабкорамі для барацьбы з рэлігіяй і дасылае свой адрас для прыцягненьня яго да ўдзелу ў гэтай справе.

Некаторыя з таварышоў падкрэсьліваюць, што барацьба з рэлігіяй не павінна пераходзіць на адміністрацыйныя рэйкі. „Ня трэба змагацца з рэлігіяй адміністрацыйнымі загадамі, здыманьнем званоў і г. д., а трэба шырэй разгарнуць агітацыю супроць рэлігіі“, піша селянін 37 г. з Чырвонай Слабады. Другія ідуць яшчэ далей і хочуць даць адмерці рэлігіі натуральным шляхам разам з культурным развіцьцём краіны. „Узьняцьце культурнасьці ўцалку — выключны і адзіны спосаб адміраньня рэлігійных настрояў“, піша атэісты, профэсар Гарацкай С.-Г. Акадэміі. У гэтых словах бязумоўна ліквідатарская стаўка на „самазьнішчэньне“ рэлігіі, на яе мэханічнае адміраньне. Гэты пункт погляду такі самы памылковы і шкодны, які і другі, выяўлены ў нашых анкетах. Тэхнік-рысавальнік фабрыкі „Чырвоная Зорка“ ў Чашніках (Віцебшчына) прапануе: „Усе рэлігійныя помнікі, каштоўныя для мастацтва і навукі перадаць музэям. Адным загадам закрыць усе цэрквы. Пад пагрозай кары забараніць рэлігійныя абрады, даўшы гэтым зразумець бясьсільле бога, створанага рукамі чалавека. Скончыўшы ўсе разрахункі з богам, даць яму адстаўку“. Гэтыя гістэрычныя прапановы зьяўляюцца, бязумоўна, праявамі таго „лявацтва“, якое ў нашай антырэлігійнай рабоце можа прынесьці вялікую шкоду.

Перад нашымі ваяўнічымі бязбожнікамі — анкета лішні раз гэта пацьвердзіла — стаіць задача барацьбы на два фронты: задача перамогі над опортуністычнай стаўкай на „самаадміраньне“ рэлігіі, на яе зьнішчэньне з часам і г. д. —

з аднаго боку; барацьбы з архірэволюцыйнымі імкненьням адным адміністрацыйным прыскокам скончыць з рэлігіяй — з другога боку. Перад намі задача упартай, сыстэматычнай, няўтомнай і рашучай антырэлігійнай работы паводле прынцыпаў марксызму-ленінізму.

## ПРОЦЭС АДЫХОДУ АД РЭЛІГІІ.

Мы подрабязна спыняліся на фактарах, абумовіўшых адыход дасьледваных намі ад рэлігіі. Але далёка не заўсёды гэтыя фактары можна ўлічыць. Часта адыход ад рэлігіі зьяўляецца вынікам чыннасьці цэлага раду ці, правільней кажучы, комплексу фактараў, якія рэволюцыянуюць сьветапогляд і перарабляюць яго з рэлігійнага ў атэістычны.

У такіх выпадках у наяўнасьці досыць доўгі, часам вельмі складаны процэс. Аб гэтай складанасьці сьведчыць рад анкет, некаторыя з іх трэба адзначыць.

Вось, напр., навуковы працаўнік 48 г. апавядае аб сваіх адносінах да рэлігіі. Сын вайсковага інжынэра, бацькі дваране. Выхоўвала гуварнантка — кальвінка. На афармленьне рэлігійнага сьветапогляду моцна ўплывала бабка. У маладым узросьце атрымаў моцную рэлігійную прышчэпку на грунце біблійных і евангэльскіх паданьняў. З наіўнай верай і пашанай спавядаўся, гавеў, прымаў прычасьце. У гімназіі рэлігійнасьць пачала выпятрацца і абрады выконваў формальна. Скончыўшы гімназію, кінуў абрады зусім. Цяпер мае „шчырую агіду да ўсялякай рэлігійнасьці вакольных людзей, нянавісьць да пропагандыстых рэлігійнага наркозу, прызнае патрэбу барацьбы з рэлігіяй ва ўсіх яе праявах“. У адзначаным выпадку ў наяўнасьці роўна і паступова раскрыты, працёкшы не асабліва бурна, процэс пераходу ад рэлігіі да бязбожжа. Але далёка не заўсёды гэты процэс адбываецца так проста.

Няпісьменны селянін з с. Крупец 72 г. аб пераломе, які яму давялося перажыць ад веры да бязбожжа на 58 г.

жыцьця кажа: „Сам пераканаўся, што бога няма, калі вайна пашла. Потым дапамагла савецкая ўлада праз наш нардом. Агітатары цалкам умацавалі маё бязбожжа. Дадам, што шмат старых ня верaць, але ўсе жывуць па-старому, а сапраўды бога няма і ніхто яго ня бачыў у тым ліку і ўсе мае аднагоднікі“.

Вось як апісвае працэс свайго адыходу ад рэлігіі студэнт БДзУ, 34 г. Усё разьвіцьцё ў дзіцячым веку, усе першыя крокі жыцьця адбываліся пад самым моцным уплывам рэлігіі. Чытаўшы аб жыцьці сьвятых ледзь не пашоў 12-13 год „ратавацца“ ў лес паводле прыкладу тых старцаў, пра якіх чытаў. Верыў да 18 год. У гэты час, калі я быў у настаўніцкай сэмінарыі, у мяне пачалі зьяўляцца думкі супраць існаваньня бога. „Але гэта былі першыя праблескі атэізму, нерашучыя, нявыразныя, ня маючыя под сабой грунту ў вакольным жыцьці і загаснуўшыя не разгарэўшыся“... Потым зноў пачаліся пошукі атэізму ў часе вайны. Рэволюцыя дала ім новы грунт. Але толькі ў БДзУ апытаны ўступіў у новую фазу бязбожжа. „Мне грунтоўна дапамагло вывучэньне законаў разьвіцьця грамадзтва, законаў прыроды, вывучэньне дыялектычнага матар‘ялізму, чытаньне філёзофскіх кніг“. „Пералом быў выкліканы знаёмствам з законамі разьвіцьця грамадзтва, з клясавай барацьбой і агіднай роляй рэлігіі ў гэтай барацьбе. Мае пэрыоды: першы да 8 год — паступовае вызваленьне ад рэлігійнага дурнап‘яну і прымусовае выкананьне абрадаў; 2 — ад 10—16 год пэрыод самай моцнай веры і добраахвотнага выкананьня абрадаў; 3 — ад 17 да 24 г. пэрыод хістаньня, узважваньня і 4 пэрыод ад 24 да цяперашняга поўнага атэізму“.

Вось што апавядае пра сваё мінулае навуковы працаўнік-беларус 40 г. — актыўны дзеяч антырэлігійнай прапаганды. Выхаваны ў рэлігійнасьці. У 13 год бацькі завялі да ксяндза, пад уплыў якога і трапіў; дзякуючы ксяндзу быў зьмешчаны ў прытулак, дзе прымушалі выконваць усе рэлігійныя абрады. 18 год пад націскам маткі паступіў у духоўную сэмі-

нарыю, пасьля быў накіраваны ў духоўную акадэмію. „У сэмінарыі хацеў ўвераваць. Хутка вывучыў багаслоўе, схолястыку. Але на кожны довад „за“ існаваньне бога, я знаходзіў „супраць“. Гэта ўсё было мне вельмі цяжка, бо прымушала (у казаньнях) гаварыць адно, думаць другое. Я ня мог перанесьці такое становішча і з першай парафіі, куды я быў прызначаны, я кінуў сваю рэлігійную пасаду. Зрабіў так пад націскам супярэчнасьці: няверы і выкананьня рэлігійных абрадаў. Апрача таго, не хацеў падрымліваць уладу эксплёататараў і капіталістых, што я павінен быў рабіць, як прадстаўнік культу“.

Яшчэ больш складаным быў процэс разрыву з рэлігіяй у другога навуковага працаўніка—яўрэя—цяпер ваяўнічага бязбожніка, самага актыўнага антырэлігійнага працаўніка. Ужо ў раньнім маленстве ён быў моцна веручым. Бога ўяўляў сабе як „вышэйшага контролёра, які наглядае за ўсім і ўсімі“. Абрады ахвотна выконваў, часткова з прычыны страху кары з боку бога. Да 10 год бязумоўна верыў, потым пачаліся хістаньні, пэрыоды скэптыцызму, якія чаргаваліся з рэлігійнымі парываньнямі, даходзіўшымі да значнай вострасьці, з імкненьньнем „адпакутваць грэх“.

Атрымаў клерыкальную яўрэйскую асьвету, меўшую вялікі ўплыў пераважна на эмоцыянальны бок, — ідэя „самаўдасканаленьня“ і адмаўленьня ад „радасьці гэтага сьвету“. Першы крызіс веры быў у 14 год—гады ўцякацтва, але ён ня быў канчатковым. Зноў былі хістаньні, пэрыод спробы замяніць яўрэйскую рэлігію рэлігіяй „сусьветнага розуму“ і толькі ў 16 г. надышоў рашучы перелом.

Вось найбольш цікавыя ўзоры таго, як доўга, балюча, як складана адбываўся ў некаторых апытаных процэс, што знаходзіць сваё канчатковае заканчэньне ў іх неўзваротным уступленьні на шлях ваяўнічага бязбожжа.

# ВЫВАДЫ.

Якія агульныя вывады мы можам зрабіць пасьля нашага дасьледваньня?

1. Анкета пацьвердзіла жывучасьць рэлігіі. Яна паказала, што пад уладай рэлігіі на 14 годзе рэволюцыі знаходзяцца яшчэ значныя масы насельніцтва.

2. Сярод веручых толькі нязначная частка зьяўляецца фанатычнымі прыхільнікамі рэлігіі, людзьмі ўстойлівай і нязрушнай веры, пераконанымі, часам ваяўнічым рэлігійнікамі.

3. Сярод рэлігійнікаў — пераважная колькасьць людзей, вера якіх у рэволюцыйныя гады шмат страціла ў сваёй устойлівасьці, але якія імкнуцца захаваць гэту вера ад крытычнага перагляду збоку.

4. Значная частка веручых, рэлігійныя пераконаньні якіх зрушаны рэволюцыйнай эпохай, не парываюць канчаткова з рэлігіяй, але застаюцца на недарэчнай позыцыі—„няўстойлівых“ з прычыны бытавой традыцыі і псыхічнай інэрцыі.

5. Апошнія вельмі слабы, а часам іх зусім няма ў асоб больш маладога веку. Дзякуючы гэтаму, рэлігійнасьць і ўзрост паводле нашай анкеты знаходзяцца ў адваротнай пропорцыянальнасьці.

6. Дасьледваньне выявіла надта высокую атэістычнасьць рабочых, крыху менш высокую, але ўсё-ткі вельмі значную—навуковых працаўнікоў і працаўнікоў асьветы. Яно выявіла рэзкую разьніцу ў адносінах да рэлігіі сялян-колгасьнікаў і індывідуальных гаспадароў.

7. Анкета паказала, што няпісьменнасьць і малакультурнасьць—лепшае асяродзьдзе для мікробаў рэлігійнасьці.

8. Рэлігійныя ўяўленьні, выяўленыя анкетай, характарызуюцца значнай прымітыўнасьцю—з аднаго боку, аднастайнасьцю і трафарэтнасьцю—з другога. Для пэўнай часткі веручых характэрна адсутнасьць выразных рэлігійных уяўленьняў і імкненьне падмяніць іх містычна-этычнымі нормамі.

9. У пераважнай большасьці веручых рэлігійныя настроі выліваюцца ў абрадавую форму. Абрадавасьць часта пераважывае рэлігійнасьць, з гэтае прычына часта пашырана выкананьне абрадаў тымі, хто страціў веру. Гэтаму спрыяе сіла традыцыі, эмоцыянальнае значэньне абрадаў і, урэшце, націск выкольнага асяродзьдзя.

10. Сярод аргумэнтаў, якімі опэруюць рэлігійнікі, найбольш пашыраны довад канечнай патрэбы рэлігіі, як рэгулятару „грамадзкага парадку“.

11. Уплыў сям'і, выяўлены анкетай, у большасьці выпадкаў ішоў па лініі прыгнечаньня яе членаў рэлігіяй. У рэволюцыйны час сям'я часта робіцца арэнай сутычкі між рэлігійнікамі і бязбожнікамі, што выклікае конфлікты між бацькамі і дзяцьмі, між старымі і моладзьдзю і г. д.

12. Анкета адбіла тэолёгізуючы ўплыў дарэволюцыйнай і атэістычны ўплыў савецкай школы на сваіх выхаванцаў.

13. Важнейшыя фактары разрыву з рэлігіяй, сьцверджаныя анкетай, наступныя: высьвятленьне клясава-эксплёататарскай ролі рэлігіі і яе служак (у большасьці на конкрэтных бытавых прыкладах; асабліва значную ролю ў гэтым кірунку адыграла імпэрыялістычная вайна), паляпшэньне экономічнага становішча прыгнечаных у сувязі з рэволюцыяй, пашырэньне прыродазнаўчых ведаў, тэхнізацыя сельска-гаспадарчай вытворчасьці.

14. Анкета паказала, што антырэлігійная агітацыя і пропаганда зьяўляюцца моцнымі вагарамі пашырэньня бязбожжа. Адначасна яна выявіла слабы размах нашай агітацыйна-пропагандыцкай работы і яе часта нізкі якасны ровень, слабую кваліфікацыю кадраў, якія вядуць гэту работу.

15. Дасьледваньне выявіла пепарыўную, органічную сувязь між узростам бязбожжа і процэсам социялістычнага будаўніцтва—з аднаго боку, між устойлівасьцю рэлігійнасьці і супраціўленьнем капіталістычных элемэнтаў гэтаму будаўніцтву—з другога.

16. Усе сабраныя матар'ялы сьцьвярджаюць патрэбу самай актыўнай антырэлігійнай барацьбы і ўзьняцьця на вышэйшую ступень агітацыйна-пропагандыцкай работы, мобілізацыі вакол яе найшырэйшых мас ваяўнічых бязбожнікаў, конкрэтнага выяўленьня сувязі між рэлігійнасьцю і супраціўленьнем социялістычнаму будаўніцтву, падрабязнага вывучэньня социяльных карэньняў і клясавага твару рэлігіі ў СССР. Адначасна матар'ялы перасьцерагаюць ад спроб вырашэньня вельмі складанай задачы антырэлігійнай барацьбы мэтодамі адміністрацыйнай шчырасьці. Правераная тактыка бальшавіцкай генэральнай лініі барацьбы на два фронты павінна быць кіраўнічым прынцыпам і ў нашай антырэлігійнай рабоце.

# ДАДАТАК

*Табл. № 1.*

**Колькасьць абсьледваных (у абсолютных лічбах).**

| | | Веручыя | | | Няверучыя | | | Усіх | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | м. | ж. | усіх | м. | ж. | усіх | м. | ж. | аб. роду |
| Гарады | пісьм. | 17 | 21 | 38 | 201 | 76 | 277 | 218 | 97 | 315 |
| | няпіс. | 1 | 10 | 11 | 3 | 5 | 8 | 4 | 15 | 19 |
| | усяго | 18 | 31 | 49 | 204 | 81 | 285 | 222 | 112 | 334 |
| Сельск. мясц. | пісьм. | 183 | 74 | 257 | 753 | 193 | 946 | 936 | 267 | 1203 |
| | няпіс. | 75 | 133 | 207 | 39 | 45 | 84 | 114 | 178 | 292 |
| | усяго | 258 | 207 | 465 | 792 | 238 | 1030 | 1050 | 445 | 1945 |
| Усяго | пісьм. | 200 | 95 | 295 | 954 | 266 | 1223 | 1154 | 364 | 1518 |
| | няпіс. | 76 | 143 | 219 | 42 | 50 | 92 | 118 | 193 | 311 |
| | разам | 276 | 238 | 514 | 996 | 319 | 1315 | 1272 | 557 | 1829 |

*Табл. № 2.*

**Колькасьць абсьледваных (у %%).**

| | | Веручыя | | | Няверучыя | | | Усіх | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
